Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
13 СНЕЖНЯ 2016 г. АЎТОРАК № 240 (28350)
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Вялікая сіла добрай волі**
СТАР. 6



**Навошта ваўку GPS?**
СТАР. 8



**Пра жыццё на вышыні**
СТАР. 15

■ Аты-баты

# ЭКЗАМЕН НА САЛДАЦКУЮ СТАЛАСЦЬ



Фота БЕЛТА.

**Самыя галоўныя салдацкія словы на вернасць Айчыне гучалі па ўсёй краіне ў мінулую суботу. Па традыцыі каля 1800 навабранцаў прамаўлялі іх у 72-м гвардзейскім аб'яднаным вучэбным цэнтры падрыхтоўкі прапаршчыкаў і малодшых спецыялістаў, што знаходзіцца ў Пячах пад Барысавам. Сведкамі гэтай урачыстасці сталі іх родныя і блізкія, якія з'ехаліся сюды з усёй Беларусі.**
СТАР. 3

■ Цікавая практыка

## КУРСЫ З ДЫЯГНОСТЫКАЙ

### На Міншчыне сумяшчаюць медыцынскае абследаванне маладых кіраўнікоў з магчымасцю павышэння іх кваліфікацыі

**Увогуле, у цэнтральным рэгіёне назіраецца тэндэнцыя амаладжэння кіруючых кадраў. Толькі на працягу трох апошніх гадоў пяць раёнаў узначалілі людзі ва ўзросце 34—40 гадоў. За апошнія два-тры гады кіраўнікамі 56 гаспадарак Мінскай вобласці сталі маладыя людзі ва ўзросце да 35 гадоў. «Яшчэ 23 маладыя чалавекі прынялі рашэнне ўзначаліць працоўныя калектывы сельгасарганізацый, — расказаў пра сітуацыю гэтага года старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА. — У іх пакуль няма высокіх ураджаяў, значных прыбавак у надоях, але ж яны прыйшлі далёка не ў перадавыя гаспадаркі. З цягам часу ў іх усё атрымаецца».**

Асноўныя крытэрыі для залічэння ў кадравы рэзерв вобласці — вынікі дзейнасці на займаемай пасадзе, вопыт работы, лідарскія і арганізатарскія здольнасці, уменне імгненна прымаць рашэнне на аснове аналізу сітуацыі, і галоўнае — гатоўнасць да адказнасці, жаданне вучыцца і ўдасканальвацца.

Безумоўна, для таго каб моладзь добра сябе праявіла, патрэбны стымул. Нядаўна на абласных «Дажынках» 10 маладым перспектыўным кіраўнікам уручаны сертыфікаты на 1 млрд рублёў (недэнамінаваных) для набыцця сельскагаспадарчай тэхнікі. Штогод пасля таго, як сабраны ўраджай, для іх ладзяцца курсы павышэння кваліфікацыі, дзе яны вучацца, пераймаюць перадавы вопыт і адначасова праходзяць медыцынскае абследаванне, набіраюцца сіл перад веснавой сяўбой. Карэспандэнт «Звязды» пабывала ў санаторыі «Сасновы Бор» Маладзечанскага раёна, дзе цяпер адпачываюць маладыя кадры Міншчыны.
СТАР. 4

■ На кантролі

## ХТО ВІНАВАТЫ Ў ДЗІЦЯЧАЙ АГРЭСІІ?

### Кіраўнікі праваахоўных органаў заклікаюць дырэктараў навучальных устаноў не ўтойваць негатыў

**Прыняты ў 2006 годзе Дэкрэт Прэзідэнта №18 «Аб дадатковых мерах дзяржаўнай абароны дзяцей у сацыяльна неўладкаваных сем'ях» і Закон «Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў» дазволілі кардынальна палепшыць сітуацыю ў краіне ў сферы падлеткавай злачыннасці. У прыватнасці, на Віцебшчыне колькасць крымінальных злачынстваў, удзельнікамі якіх з'яўляліся дзеці, скарацілася за гэты час у 4 разы: з 1111 выпадкаў у 2006 годзе да 285 у 2015. Але сёлета ў названым рэгіёне зарэгістраваны рост крымінальных спраў у дачыненні да падлеткаў — на 4,2% больш, чым летась. Узровень насілля з боку непаўналетніх у Віцебскай вобласці ўпершыню перавысіў сярэдні рэспубліканскі паказчык і дасягнуў 3,5% (па Беларусі — 3,4%).**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.
СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ



**Наталля КАЧАНАВА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Пастаўленая кіраўніком дзяржавы задача па стварэнні новых працоўных месцаў сёлета выканана. У 2016 годзе ў нашай краіне павінна было з'явіцца 50 тысяч працоўных месцаў, на сённяшні дзень іх створана 54 тысячы. На наступны год урад плануе забяспечыць 70 тысяч новых працоўных месцаў. Мы абавязаны ствараць новыя працоўныя месцы, адкрываць вытворчасці і прадпрыемствы для таго, каб чалавек мог працаўладкавацца і рэалізаваць свае правы, але і грамадзяне павінны разумець, што іх абавязак — працаваць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.12.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9547 | ▼ |
| Еўра | 2,0656 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0317 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0746 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Ва ўрадзе

# СПАЖЫВЕЦКІ РЫНАК СТАБІЛЬНЫ

**Падчас чарговага пасяджэння Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь былі разгледжаны пытанні фінансава-эканамічнага становішча арганізацый цэментнай і шкляной прамысловасці, ход працы па зніжэнні сабекошту выпускаемай імі прадукцыі і рэалізацыя Праграмы эфектыўнага выкарыстання магутнасцяў арганізацый цэментнай прамысловасці на 2015 — 2020 гады. Таксама разгледжаны вынікі работы па стабілізацыі і развіцці ўнутранага спажывецкага рынку, у тым ліку ў сельскай мясцовасці.**

Падчас разгляду фінансава-эканамічнага становішча арганізацый цэментнай і шкляной прамысловасці Андрэй Кабякоў адзначыў, што кіраўнік дзяржавы і ўрад надалі дастаткова ўвагі вырашэнню іх праблем. «Таму мы маем права патрабаваць ад Мінбудархітэктуры, кіраўнікоў прадпрыемстваў эфектыўнай працы і, перш за ўсё, у пытаннях зніжэння выдаткаў і нарошчвання аб'ёмаў экспартных паставак», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Аналізуючы вынікі працы па развіцці ўнутранага спажывецкага рынку, у тым ліку ў сельскай мясцовасці, Андрэй Кабякоў адзначыў, што ў цэлым сітуацыя стабільная. «У поўным аб'ёме забяспечана выкананне дзяржаўных сацыяльных стандартаў у галіне гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва, у гандлёвых аб'ектах прадстаўлены шырокі асартымент харчовых і нехарчовых тавараў у розных цэнавых сегментах, не дапушчана перабояў пастаўкі тавараў, спекулятыўнага росту цэн, узровень інфляцыі знаходзіцца ў прагнозных параметрах», — падкрэсліў прэм'ер-міністр. Так, доля гандлю ў валавым унутраным прадукце (ВУП) краіны склала 11,2%. Гэта другое месца сярод галін эканомікі пасля перапрацоўчай прамысловасці.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Супрацоўніцтва

# Ад сельскай гаспадаркі да аховы здароўя

## У Вашынгтоне абмеркавалі беларуска-амерыканскія праекты

**Па запрашэнні Дзяржаўнага дэпартамента ЗША ў Вашынгтоне з 6 па 10 снежня знаходзілася эканамічная дэлегацыя нашай дзяржавы высокага ўзроўню. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе Міністэрства замежных спраў.**

У склад дэлегацыі ўвайшлі намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Мікалай Снапкоў, памочнік Прэзідэнта Беларусі Усевалад Янчэўскі, прадстаўнікі кіраўніцтва Нацыянальнага банка, Міністэрства фінансаў, Міністэрства эканомікі, іншых міністэрстваў і ведамстваў.

Прадстаўнікі нашай краіны правялі перамовы ў шэрагу ключавых урадавых агенцтваў ЗША: Дзяржпартаменце, Міністэрстве гандлю, Офісе гандлёвага прадстаўніка ЗША, Федэральнай камісіі сувязі, Міністэрстве сельскай гаспадаркі, Агенцтве міжнароднага развіцця ЗША (USAID).

Як паведаміла прэс-служба знешнепалітычнага ведамства, абмеркаваны канкрэтныя пытанні эканамічнага і гандлёва-інвестыцыйнага супрацоўніцтва абедзвюх краін, дасягнуты прынцыповыя дамоўленасці аб актывізацыі ўзаемадзеяння абодвух бакоў у сферах фінансаў і інвестыцый, высокіх тэхналогій, сельскай гаспадаркі і энергетыкі. Акрамя таго, адбыліся рабочыя сустрэчы з кіраўніцтвам Асацыяцыі прыватнага інвеставання на рынках, што развіваюцца, з кіраўніцтвам найбуйнейшых амерыканскіх карпарацый: Microsoft, AGCO, Case New Holland... Абмеркаваны канкрэтныя інвестыцыйныя праекты для рэалізацыі ў Беларусі.

У рамках візіту праведзены перамовы з намеснікам дырэктара-распарадчыка МВФ Міцухірам Фурусавам па пытаннях падрыхтоўкі праграмы МВФ для Беларусі. Беларуская дэлегацыя наведала тэхналагічны цэнтр карпарацыі Microsoft і правяла перагаворы па падрыхтоўцы пагаднення аб стратэгічным супрацоўніцтве паміж гэтай кампаніяй і Беларуссю. У рамках пагаднення плануецца рэалізацыя шэрагу праектаў па ўкараненні найноўшых тэхналагічных рашэнняў у сферах аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, лагістыкі і сістэм кіравання. Сустрэчы паказалі гатоўнасць бакоў да пераходу амерыкана-беларускіх адносін у сферы эканомікі і інвестыцый на новы, больш высокі ўзровень. Намечаны практычныя крокі па ажыццяўленні дасягнутых дамоўленасцяў у жыццё.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushevich@zviazda.by*

■ Перадкаляднае

# МІСІЯ Ў ІМЯ ДАБРЫНІ

## Жонкі паслоў гандлявалі нацыянальнымі стравамі і напоямі



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«Місія ў імя дабрыні» — так называюць традыцыйны дабрачынны кірмаш удзельніцы Мінскага міжнароднага жаночага клуба жонак паслоў, дыпламатаў і замежных прадстаўнікоў, якія днямі ў 24-ы раз зладзілі ў Мінску яскравае свята. Нацыянальныя стравы і напоі, сусветна вядомыя традыцыйныя ўборы, вырабы народных рамёстваў больш як з 30 краін, а таксама сувеніры, кнігі, памятныя падарункі — гэта толькі невялікі пералік таго, чым здзіўлялі гасцей.

Шмат што з прапанаваных сувеніраў і прысмакаў гатавалі самі жонкі паслоў, якія ўдзельнічалі ў кірмашы разам са сваімі роднымі. Пры гэтым многія тавары наведвальнікі раскупілі яшчэ да афіцыйнага адкрыцця мерапрыемства. Вялікім попытам карысталіся расійскія паўлапасадскія хусткі, мексіканскія соусы і самбрэра, эстонскі глінтвейн, рыжскі бальзам і самыя разнастайныя нацыянальныя прысмакі.

— Гэты кірмаш — вельмі добрая ідэя, праз якую прадстаўнікі еўрапейскіх краін могуць дапамагчы людзям у нястачы: дзецям, старым. Тут назіраецца адзінства ў рознасці, — зазначыла **кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў Беларусі Андрэа ВІКТАРЫН.**

Атрыманыя сродкі будуць накіраваны на падтрымку розных дабрачынных праектаў (гэта дапамога дзіцячым дамам, медыцынскім установам, інвалідам і састарэлым).

— Наведваючы бальніцы, дамы-інтэрнаты і сацыяльныя прытулкі, мы бачым рэальны клопат беларускай дзяржавы пра людзей. Аднак мы разумеем, што заўжды можна зрабіць лепш тым, каму патрабуецца падтрымка, — зазначыла **Халуд АРЫКАТ, прэзідэнт Мінскага міжнароднага жаночага клуба жонак паслоў, дыпламатаў і замежных прадстаўнікоў, жонка пасла Дзяржавы Палесціна.** — Мы не маем магчымасці выратаваць увесь свет, аднак у нашых сілах паклапаціцца пра тых, хто побач і просіць дапамогі.

Бадай што ніводзін з завітаўшых на кірмаш не застаўся без пакупкі ці падарунка. Прадстаўнікі пасольстваў падрыхтавалі шыкоўныя лоты-прызы, якія чатыры разы на працягу дня разыгрываліся сярод удзельнікаў латарэі. Білет на яе, дарэчы, каштаваў два рублі, і многія набывалі іх проста дзясяткамі. Некаторым шчаслівчыкам такім чынам дасталося па некалькі падарункаў. Дадайце сюды насычаную музычную праграму з нацыянальнымі спевамі і танцамі розных краін — і зразумееце, чаму дзень на кірмашы прайшоў незаўважна хутка, а людзей было столькі, што паміж стэндамі пасольстваў прыходзілася літаральна праціскацца.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

**Больш падрабязна пра тое, што прывабlівала гасцей кірмашу і якімі сакрэтамі дзяліліся жонкі паслоў, чытайце і глядзіце на www.zviazda.by**

# ДАСТУПНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

## Павялічыцца аб'ём тэлевяшчання для людзей з праблемамі слыху

**Такія планы агучыла міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ падчас учарашняга пасяджэння прэс-клуба ў рамках рэгіянальнай кампаніі ААН «Інклюзіўная Беларусь». «Прыватны канал «Жэст», які ёсць, не вырашае ўсе задачы. Трэба нарошчваць аб'ём інфармацыі для людзей, якія слаба чуюць. Ужо закладзена фінансаванне пад гэтыя мэты», — адзначыла Ананіч.**

Па словах міністра, стварэць лепшыя ўмовы для рэалізацыі патэнцыялу кожнага грамадзяніна — задача не толькі асобных ведамстваў і арганізацый, але і сродкаў масавай інфармацыі. «Журналісты здольныя даць новы імпульс развіццю гэтай тэмы. І ў рамках рэалізацыі Канвенцыі аб правах інвалідаў Міністэрства інфармацыі распрацоўвае план дзеянняў на пяцігодку».

Сёння дзяржава падтрымлівае выпуск кніг шрыфтам Брайля. Закупляюцца неабходныя тэхналогіі, выдаткоўваюцца грошы. Газеты ж, якая друкавалася б шрыфтам Брайля, у краіне пакуль няма. Але, запэўніла Лілія Ананіч, калі рэдакцыі будуць пашыраць сваю дзейнасць і прапануюць іншыя формы падачы інфармацыі, запатрабаваныя ў чытачоў, міністэрства гатова падтрымаць ініцыятыву.

Кампанія «Інклюзіўная Беларусь» праходзіць з 24 кастрычніка. Семінары і прэс-канферэнцыі па тэме безбар'ернага асяроддзя адбыліся ў пяці гарадах. «Трэба стварыць інфармацыйную стратэгію для таго, каб дапамагчы СМІ знайсці баланс у падачы пытанняў, звязаных з правамі людзей з інваліднасцю, іх звычайным жыццём, пазбегнуць непатрэбнага жалю, — тлумачыць важнасць **кампаніі Кацярына ПАНІКЛАВА, намеснік Пастаяннага прадстаўніка ПРААН** у Беларусі. — Мы рады, што Міністэрства інфармацыі надае гэтаму такую вялікую ўвагу».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Вынікі тыдня

# НОВЫЯ САЮЗНІКІ І СТАРЫЯ КАНФЛІКТЫ



**У свежым нумары Financial Times апублікаваны артыкул аб новым геапалітычным стымулюючым фактары для росту каціровак на нафту — пагадненні Расіі і Саудаўскай Аравіі аб неабходнасці прымаць сур'ёзныя меры па павышэнні нафтавых цэн. У выніку ўзятых абмежаванняў па здабычы нафты раніцай 11 снежня цана на «чорнае золата» маркі Brent упершыню з сярэдзіны 2015 года перасягнула суму 57 долараў.**

У гэтым назіранні ёсць разумнае зерне. У свеце ў дадзены момант ёсць тры найбуйнейшыя вытворцы нафты — ЗША, Расія і Саудаўская Аравія. Дамоўленасці дзвюх з іх знізяць або павышаць цэны на нафту здольныя сур'ёзна рухаць рынак. Уласна кажучы, гэта і адбылося вясной 2014 года, калі ЗША і Саудаўская Аравія па дамоўленасці абрынулі нафтавыя цэны на сусветным рынку. ЗША трэба было пакараць Расію за Крым, пазбавіўшы велізарных даходаў ад экспарту нафты і нафтапрадуктаў (у 2013 годзе Расія зарабіла на іх 280 мільярдаў долараў), а Саудаўская Аравія не выстаяла пад магутным ціскам сваіх найважнейшых заходніх саюзнікаў, якія забяспечваюць іх ваенную бяспеку. З таго часу шмат што змянілася. У верасні 2016 года ў ЗША быў прыняты закон, які дазваляе ахвярам тэракту 11 верасня 2001 года падаваць у суд на ўрад Саудаўскай Аравіі, што ставіць пад пагрозу ўкладанні краіны ў сотні мільярдаў долараў на амерыканскай тэрыторыі. Усе спробы Барака Абамы спыніць прыняцце закона, каб не сварыцца з найважнейшым саюзнікам, праваліліся. А прыход да ўлады новага амерыканскага прэзідэнта палохае саўдзітаў з-за яго імкнення да ізаляцыянізму, што можа пакінуць Саудаўскую Аравію сам-насам са сваімі ворагамі.

**Імпічмент прэзідэнта Паўднёвай Карэі** не стаў нечаканасцю для назіральнікаў. Па ўсіх загадзя праведзеных апытаннях грамадскай думкі, нацыя згуртавалася ў імкненні адхіліць ад улады Пак Кын Хе, і большасць дэпутатаў былі гатовыя падтрымаць сваіх выбаршчыкаў. У гэтай сітуацыі прэзідэнту было больш разумна самастойна падаць у адстаўку, каб пазбегнуць ганьбы з-за імпічменту, але Пак Кын Хе вырашыла інакш. Рашэнне аб імпічменце яшчэ павінен падтрымаць Канстытуцыйны суд Паўднёвай Карэі. Пакуль што функцыі кіраўніка дзяржавы будзе выконваць прэм'ер-міністр. Падазрэнні ў карупцыі, якія сталі прычынай імпічменту, выказваюць рашучае імкненне карэйскага грамадства змагацца з гэтай бядой усімі магчымымі спосабамі.

**Дональд Трамп працягвае прадпрымаць крокі,** здольныя, пасля яго прыходу да ўлады, сур'ёзна дэстабілізаваць амерыкана-кітайскія адносіны. Гэта можа вельмі негатыўна адбіцца на сусветнай эканоміцы, якая перажывае нялёгкія часы. У эфіры тэлеканала Fox Трамп заявіў пра негатоўнасць захоўваць ранейшую прыхільнасць да палітыкі адзінага Кітая, прызнаючы Тайвань часткай тэрыторыі краіны. Калі гэтая заява стане афіцыйнай палітыкай ЗША пасля прыходу Трампа да ўлады, няцяжка прадказаць магутную незадаволенасць урада Кітая. Падобна на тое, што Трамп спрабуе абмяняць прызнанне ЗША Тайваня часткай Кітая на ўступкі Пекіна ў галіне знешняга гандлю з ЗША, адмоўнае сальда якой вельмі вялікае. Але цяжка чакаць ад КНР гатоўнасці пайсці на падобныя меры пад палітычным ціскам. Дамоўленасці па Тайвані сталі краевугольным каменем у наладжванні адносін ЗША і Кітая ў 1970-х гадах, і спробы перагледзець гэтую канструкцыю наткнуцца на сур'ёзнае процідзеянне Пекіна ва ўсіх магчымых сферах адносін з ЗША.

Непрыемную навіну канец тыдня прынёс з Сірыі. **Пальміра**, вяртанне якой з-пад кантролю тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава» ва ўлонне Сірыі так радасна адзначалася некалькі месяцаў таму, **зноў страчаная**. Баевікі «Ісламскай дзяржавы» здолелі выкарыстаць шырокае далучэнне сірыйскай арміі ў бai за Алепа, каб прадуманым ударам вярнуць сабе кантроль над гэтым вельмі важным як у культурным, так і ў стратэгічным значэнні горадам. У той жа час аперацыя ў Алепа значна важнейшая для поспеху ўсёй вайны з «Ісламскай дзяржавай», каб адцягваць ад яе значныя сілы для вяртання Пальміры. Такім чынам, Пальміра можа затрымацца пад кантролем баевікоў.

**На парламенцкіх выбарах у Румыніі,** па дадзеных экзітполаў, левая Сацыял-дэмакратычная партыя набірае больш за 45 працэнтаў галасоў. Гэта можа дазволіць ёй зноў сфарміраваць урад, кантроль над якім быў страчаны пасля пажару ў сталічным начным клубе, у выніку якога загінула 64 чалавекі.

**Выбары таксама прайшлі ў непрызнанай Прыднястроўскай малдаўскай рэспубліцы.** Па дадзеных экзітполаў, з вялікай перавагай у 69,8 працэнта перамагае спікер парламента Вадзім Краснасельскі. Ранейшы лідар Яўген Шаўчук набірае менш за 19 працэнтаў. Гэта нядзіўна, улічваючы, што ў апошнія гады сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Прыднястроўі сур'ёзна змянілася да горшага. Хацелася б верыць, што абраным новым Прэзідэнтам Малдовы перамовы наконт рашэння праблемы Прыднястроўя адбудуцца ў бліжэйшыя месяцы і будзе знойдзена формула, якая зможа дапамагчы вырашыць гэты канфлікт.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■ Азбука бяспекі

# На Міншчыне забаранілі выходзіць на лёд

**Толькі за дзень тут патанулі шэсць чалавек**

**На тэрыторыі Мінскай вобласці ўведзена забарона выхаду на лёд на падставе прынятага адпаведнага распараджэння Мінскага абласнога выканаўчага камітэта. Дакумент падрыхтаваны ў мэтах захавання бяспекі і папярэджання няшчасных выпадкаў на вадаёмах у зімовы перыяд, бо толькі за суткі патанулі шэсць чалавек і тры (два ў Нясвіжскім і адзін у Клецкім раёне) былі выратаваны.**

Супрацоўнікі АСВОДа і міліцыі правядуць сумесныя рэйды, накіраваныя на недапушчэнне гібелі людзей на вадаёмах. Да таго ж ва ўсіх навучальных установах вобласці будуць праведзены прафілактычныя гутаркі з вучнямі і іх бацькамі па захаванні мер бяспекі ў зімовы перыяд.

У Мінскім абласным упраўленні МНС нагадалі, што ў перыяд адлігі рэкі і азёры асабліва небяспечныя, паколькі з перападамі тэмператур змяняецца не толькі таўшчыня лёду, але і яго структура. Лёд блакітнага адцення — самы трывалы. Лёд, які мае адценні шэрага, матава-белага або жоўтага колеру, з'яўляецца найбольш ненадзейным. Такі лёд абвальваецца без папярэджальнага патрэсквання. Самы ж тонкі лёд, як правіла, назіраецца ў месцах упадзення ў рэчышчы рэк ручаёў, у месцах змены кірунку плыні рэк, каля абрывістых берагоў, а таксама пад тоўстым пластом снегу і ў месцах росту кустоў і дрэў у вадзе. Ратавальнікі нагадваюць, што бяспечным для вагі чалавека лічыцца лёд, таўшчыня якога не менш за сем сантыметраў.

Калі вы праваліліся пад лёд, самае галоўнае — не паддавацца паніцы. Пакуль паміж пластамі адзення застаецца паветра, вы зможаце трымацца на плаву. Каб выбрацца з палонкі, налягайце грудзьмі на лёд і шырока расстаўце рукі, тым самым вы павялічыце плошчу апоры і паменшыце ціск на край лёду. Выбраўшыся з вады, уставаць катэгарычна забаронена, бо застаецца небяспека зноў праваліцца пад лёд, — варта адкаціцца далей і паўзком дабірацца да берага.

Калі вы раптам аказаліся відавочцам таго, што здарылася, то ў першую чаргу ацаніце абстаноўку і падумайце, ці зможаце дапамагчы чалавеку. Можа, лепш паклікаць яшчэ каго-небудзь на дапамогу, бо пры памылковых дзеяннях ёсць пагроза самому трапіць у бяду. Для аказання дапамогі ўзбройцеся палкай альбо вяроўкай, падпаўзіце да месца пралому лёду за тры-чатыры метры і падайце пацярпеламу другі канец сродку выратавання. Пасля таго, як дасталі чалавека з вады, яго неабходна адразу ж адвесці ў цёплае месца і выклікаць хуткую дапамогу.

У выпадку, калі неабходная дапамога ратавальнікаў, неадкладна тэлефануйце па нумарах 101 ці 112.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Надвор'е

# Усур'ёз і надоўга

**Ноччу ў пятніцу маразы будуць дасягаць ажно мінус 18 градусаў**

**На гэтым тыдні зіма будзе паўнапраўнай гаспадыняй. Чакаецца марознае надвор'е з тэмпературным фонам на 1—3 градусы ніжэй за кліматычную норму, паведамляе галоўны сіноптык Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Святлана РЫБАКОВА.**

У аўторак на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць халодная няўстойлівая паветраная маса, якая паступае да нас са Скандынавіі. Пераважна па паўночна-ўсходняй частцы краіны пройдзе кароткачасовы снег. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўдзень складзе 1—6 марозу. У сераду ўдзень маразы крыху адпусцяць, але ўначы стане сапраўды холадна. Днём амаль паўсюдна будзе ісці снег і мокры снег, у асобных раёнах чакаецца слабы галалёд. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 4 да мінус 11 градусаў, па ўсходзе пры праясненнях — да 15 марозу. Удзень чакаецца ад мінус 5 да плюс 2 градусаў. На працягу сутак будзе ісці кароткачасовы снег і ў чацвер. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ў чацвер складзе ад мінус 1 да мінус 8 градусаў, а ўначы пры праясненнях будзе дасягаць 13 марозу.

Самым халодным днём тыдня сіноптыкі прагназуюць пятніцу, калі ў асобных раёнах краіны чакаецца невялікі кароткачасовы снег, мокры снег, слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 марозу, пры праясненнях — да мінус 18 градусаў, удзень будзе ад мінус 2 да мінус 9.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, не вельмі камфортнае надвор'е чакае нас і на выхадныя. У суботу і нядзелю ў асобных раёнах краіны слабы туман, пройдзе кароткачасовы снег, мокры снег, на дарогах захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да мінус 10 градусаў, пры праясненнях — да 15 марозу, удзень — ад нуля да мінус 7, а па захадзе чакаецца нават да 2 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Памятныя манеты

## Певень «апрануўся» ў серабро



**Нацыянальны банк Беларусі ўводзіць у абарачэнне памятную манету «Год Пеўня» серыі «Кітайскі каляндар» наміналам 20 рублёў. У карыстанне яна трапляе з 12 снежня. Выканана з серабра пробай сплаву 925, мае масу 33,63 грама, дыяметр 38,61 мм.**

Манета мае форму круга, з пярэдняга і адваротнага бакоў — кант, які выступае па акружнасці. На аверсе ва ўнутраным крузе ў цэнтры — кампазіцыя, якая складаецца з элементаў гадзіннікавага механізма, — Сонца і Месяца; у цэнтры гадзіннікавага механізму — устаўка з фіяніта; па крузе — лічбы, якія абазначаюць гады з 2013 па 2024, па колькасці гадоў аднаго цыкла кітайскага месяцавага календара; золатам выдзелены асобныя элементы цэнтральнай кампазіцыі і 2017 (год Пеўня). На рэверсе ў цэнтры — выява завадного пеўня, размешчаная ў асяроддзі зорак; уверсе ў малюнку ключа — пазалочаны кітайскі іерогліф, які абазначае пеўня; унізе — стылізаваныя выявы і надпіс: ГОД ПЕЎНЯ. Манета адчаканена якасцю «пруф-лайк» тыражом 1000 штук.



**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

**Вось так незвычайна стартавала ў Магілёве акцыя «Нашы дзеці».**

## СВЯТА ПАЧАЛОСЯ З АЎТАПРАБЕГУ

Картэж з дзесяці аўтамабіляў праехаў па маршруце: «Дашкольны цэнтр развіцця №4 — дзіцячы садок №81— яслі-сад №34 — Магілёўская абласная псіхіятрычная бальніца». У кожную з гэтых устаноў удзельнікі акцыі завіталі з вясёлай забаўляльнай праграмай і казачнымі персанажамі. Ініцыятарам і арганізатарам аўтапрабегу выступіў Ленінскі райкам БРСМ, яго падтрымалі гарадскі аддзел МНС, Магілёўскі аўтаклуб, фітнес-клуб «Камільфо» і Магілёўская фабрыка марожанага.

Да 8 студзеня наступнага года ў Магілёўскай вобласці працягнуцца навагоднія святочныя мерапрыемствы для дзяцей з удзелам прадстаўнікоў выканаўчай і прадстаўнічай улады, кіруючых работнікаў. У рамках навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» яны наведаюць інтэрнатныя ўстановы, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу, дзіцячыя сацыяльныя прытулкі, цэнтры карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ЭКЗАМЕН НА САЛДАЦКУЮ СТАЛАСЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



— Я спадзяюся, што хлопцы трапяць у калектывы, дзе іх прымуць з годнасцю, дапамогуць авалодаць усімі прамудрасцямі вайсковай навукі, — адзначыў **міністр абароны Беларусі Андрэй РАЎКОЎ**. — Хтосьці зробіць гэта ў гэтым вучэбным цэнтры, а камусьці давядзецца засвойваць вайсковую спецыяльнасць ужо ў часцях. Нападрадзе папаўненне чакае няпростая служба. У наступным годзе яны пройдуць праз шырокамаштабныя вучэнні. Таму я ўпэўнены, што хлопцы, якія прыйшлі ў войска, скончаць службу людзьмі, на якіх можна спадзявацца і абаперціся.

Для радавога рэзерву Рамана Новака гэты дзень праходзіў незвычайна. Да яго сёння прыехалі бацькі і брат. А пасля прысягі навабранец атрымаў першае ў вайсковым жыцці званне. Кажа, што самым складаным для яго за гэты час было пачуць каманду «Рота, пад'ём!» і шостай гадзіне раніцы.

— Гэты збор будзе доўжыцца ў мяне да 23 снежня. Пасля застануцца яшчэ два — вясной і ўвосень праз паўтара года. Вучуся на аператара пераноснага зенітна-ракетнага комплексу «Ігла». Я сам з Мінска. Скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, зараз працую ў Тэатры юнага гледача. Спачатку ў войску мне было нязвыкла, але пасля ўцягнуўся ў гэты рытм. Калі ж паступаў ва ўніверсітэт, таксама шмат чаго не ўмеў *(смяецца)*. Тым больш што ў мяне бацька вайсковец — падпалкоўнік запасу, маці працуе на мытні.





Фота БЕЛТА.

— Я сам аддаў войску больш за 27 гадоў, — уступае ў размову Аляксандр Новак, бацька Рамана. —Таму стараліся выхоўваць дзяцей вернымі доўгу. І хай служыць годна — для салдата гэта галоўнае.

21-гадовы радавы Аляксандр Макаранка ў гарадзенскім жыцці працаваў тэхнікам-механікам. Скончыў Пастаўскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж. А вось якую спецыяльнасць ён будзе атрымліваць у войску, пакуль не ведае.

— Казалі, што накіруюць у Заслонава, там у часці прайду медкамісію. І толькі пасля яе скажуць, для якой менавіта спецыяльнасці я прыдатны. Ведаю ўжо дакладна адно — дадому я вярнуся з больш трывалымі поглядамі на жыццё.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК** *schklennik@zviazda.by*

## РАДЫЯЦЫЙНЫ КАНТРОЛЬ НА БЕЛАРУСКА-ЎКРАІНСКАЙ МЯЖЫ

**На ўзбраенне Брэсцкай памежнай групы працягваюць паступаць прыборы радыяцыйнага кантролю. У пачатку снежня і на беларуска-ўкраінскім участку Дзяржаўнай мяжы ў пунктах пропуску «Олтуш» і «Тамашоўка» стаў весціся такі кантроль.**

Супрацоўнікі памежнага ведамства ў рабоце выкарыстоўваюць індыкатары-сігналізатары і дазіметры-радыеметры. Як паведаміў кіраўнік прэс-службы Брэсцкай памежнай групы Аляксандр КІСЛОЎ, правяраецца могуць як асобы, што перасякаюць мяжу, так і таварна-матэрыяльныя каштоўнасці, транспартныя сродкі. Працэдура праверкі грузаў, асабістых рэчаў і машын праводзіцца паралельна з іншымі відамі кантролю і не ўплывае на час перасячэння мяжы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

## Помняць земляка-генерала

**У Беларусі добра ведаюць генерал-лейтэнанта Яўгена Васільевіча Мікульчыка, які нарадзіўся ў Пухавіцкім раёне. Пайшоў з жыцця гэты неардынарны, цікавы чалавек зусім нядаўна — у 2015 годзе.**

Землякі-пухавічане прынялі рашэнне надаць адной з вуліц горада Мар'іна Горка імя Яўгена Мікульчыка. Доўгі час — ужо будучы ў адстаўцы — генерал узначальваў Беларускі Саюз афіцэраў. Несумненна, заўсёды стараўся завітаць на Пухавіччыну, дзе ён ведаў, здаецца, сотні, а мо і тысячы жыхароў. Заўсёды цікавіўся справамі і лёсамі землякоў. Дзякуючы менавіта Яўгену Васільевічу ў горадзе і раёне рэалізаваны многія ініцыятывы, звязаныя з героіка-патрыятычным выхаваннем моладзі. Варта нагадаць і тое, што, нягледзячы на свой юны ўзрост у гады Вялікай Айчыннай вайны, будучы генерал спрычыніўся да многіх драматычных старонак выпрабаванняў землякоў і ўсяго народа Беларусі. Родная вёска Яўгена Васільевіча Міжрэчча знаходзілася ў самым эпіцэнтры партызанскай барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# Канкурыраваць толькі добрасумленна

## Дзяржстандарт прапанаваў меры па змяншэнні выдаткаў пры сертыфікацыі электратэхнікі

**Як патлумачылі ў Дзяржстандарце, у развіццё дзеючых у краіне дакументаў у сферы пацвярджэння адпаведнасці прадукцыі камітэт завяршае распрацоўку тэхнічнага кодэкса ўсталяванай практыкі, які будзе ўтрымліваць шэраг мер па зніжэнні часавых і фінансавых выдаткаў вытворцаў і імпарцёраў на сертыфікацыю электратэхнікі па патрабаваннях энергаэфектыўнасці.**




Праект дакумента ўжо размешчаны на сайце камітэта www.gosstandart.gov.by у раздзеле «Ацэнка адпаведнасці». Заўвагі і прапановы можна накіроўваць у Дзяржстандарт да **14 снежня 2016 г.** на адрас: **belst@gosstandart.gov.by**.

Так, прадугледжваецца, што пры сертыфікацыі можна будзе выкарыстоўваць пратаколы выпрабаванняў прадукцыі не толькі акрэдытаваных беларускіх лабараторый, але і акрэдытаваных лабараторый дзяржаў — членаў ЕАЭС, СНД, іншых замежных дзяржаў, а таксама вытворцаў. Гэтая мера акажа істотны ўплыў пры фарміраванні кошту работ па сертыфікацыі. Акрамя таго, прадугледжваецца вырашэнне пытання і ў частцы аналізу стану вытворчасці пры сертыфікацыі серыйна выпускаемай прадукцыі (тэрмін дзеяння такога сертыфіката складае пяць гадоў). Гэты этап не спатрэбіцца, калі будуць прадастаўлены яго станоўчыя вынікі пры правядзенні сертыфікацыі серыйна выпускаемай прадукцыі на адпаведнасць тэхнічным рэгламентам Мытнага саюза на нізкавольтнае абсталяванне і электрамагнітную сумяшчальнасць тэхнічных сродкаў у акрэдытаваных органах па сертыфікацыі дзяржаў ЕАЭС.

— Дыяпазон прапанаваных мер дазволіць вытворцам і імпарцёрам выбраць прымальны для сябе варыянт доказаў адпаведнасці сваёй прадукцыі патрабаванням па энергаэфектыўнасці і знізіць выдаткі. Можна меркаваць, што імі не змогуць скарыстацца толькі тыя, хто завозіць электратэхніку невядомага паходжання з непацверджанымі характарыстыкамі, тым самым уводзячы ў зман айчынных спажыўцоў і нядобрасумленна канкуруючы з партнёрамі на рынку, — адзначылі ў прэсслужбе Дзяржстандарта.

Віды электратэхнічнай прадукцыі, на якія будзе ўводзіцца абавязковая сертыфікацыя, з'яўляюцца найбольш энергаспажывальнымі бытавымі ўстройствамі. Купляючы тавар з высокім класам энергаэфектыўнасці з мэтай эканоміі энергарэсурсаў і, адпаведна, платы за іх, спажыўцу важна, каб клас энергаэфектыўнасці сапраўды адпавядаў заяўленаму ў маркіроўцы. «Пры эксплуатацыі, напрыклад, халадзільніка класа А+ плата за спажытую ім электраэнергію будзе ў два разы меншая, чым пры карыстанні халадзільнікам класа В. Для забеспячэння прысутнасці на рынку краіны энергаэфектыўнай прадукцыі з пэўнымі заяўленымі характарыстыкамі і ўводзіцца абавязковая сертыфікацыя па патрабаваннях энергаэфектыўнасці», — адзначылі ў Дзяржстандарце.

**Дар'я ГАСЦІЛОВІЧ.**

## Будзь у курсе!

### ПРАВА НА БЯСПЛАТНЫ ПРАЕЗД ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ — БЕСТЭРМІНОВАЕ

**Для школьнікаў Мінскага раёна і сталіцы захоўваецца права бясплатнага праезду на вучобу. Гэта рэгламентавана рашэннем Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў ад 16 лістапада 2016 года №247, якое апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Дакументам уносяцца змяненні ў рашэнне Мінгарсавета №232 ад 13 верасня 2016 года «Аб дадатковых мерах па сацыяльнай падтрымцы навучэнцаў». Устаноўлена, што права на бясплатны праезд маюць навучэнцы сталічных устаноў агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі Мінска на грамадскім транспарце, які ажыццяўляе гарадскія аўтамабільныя перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах, гарадскім электрычным транспарце і ў метрапалітэне. Таксама такая падтрымка прадугледжана для навучэнцаў, якія пражываюць на тэрыторыі Мінскага раёна, для праезду ў прыгарадным аўтамабільным транспарце ў рэгулярных зносінах да месца вучобы і назад у перыяд з 1 верасня па 30 чэрвеня. Права на бясплатны праезд рэалізуецца на падставе электроннай карткі навучэнца (пры яе адсутнасці — даведкі), якая пацвярджае навучанне ў сталічнай установе адукацыі. Паводле інфармацыі дзяржаўнай установы «Сталічны транспарт і сувязь», раней меры сацыяльнай падтрымкі навучэнцаў замацоўваліся ў некалькіх дакументах, тэрмін дзеяння якіх заканчваўся ў 2016 годзе. У дадзеным дакуменце права на бясплатны праезд носіць бестэрміновы характар. Рашэнне ўступае ў сілу з 1 студзеня 2017 года.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## Класныя навіны

### ШКОЛА БУДУЧЫНІ — ВАЧЫМА СТАРШАКЛАСНІКАЎ

**Рэспубліканскі конкурс для навучэнцаў педагагічных класаў «Будучыя педагогі — пра школу будучыні» ўпершыню праводзіцца ў Беларусі. Яго арганізатарам выступіў Цэнтр развіцця педагагічнай адукацыі БДПУ.**

Удзел у конкурсе — выдатная магчымасць для навучэнцаў асэнсаваць ролю прафесіі настаўніка ў святле выклікаў заўтрашняга дня, праявіць свае здольнасці ў навуковым або мастацкім плане, напоўніць школьнае жыццё новымі знаёмствамі і яркімі ўражаннямі, умацаваць сяброўства і супрацоўніцтва паміж педагагічнымі класамі краіны.

Улічваючы шматаспектнасць заяўленай тэмы, старшакласнікі могуць выбраць той аспект, які палічаць найбольш значным (гэта могуць быць інавацыі ў адукацыі, роля настаўніка, вобраз навучэнцаў, інфармацыйныя тэхналогіі ў школе будучыні ці нейкі іншы).

Конкурс праводзіцца ў наступных намінацыях: «Навукова-даследчы праект» (навуковае паведамленне, артыкул, мадэль); «Мультымедыйны праект» (прэзентацыя, мультфільм, відэаролік, відэафільм, калаж, малюнак) і «Літаратурная творчасць» (верш, эсэ, нарыс).

Асноўныя крытэрыі ацэньвання работ: аргументаванасць, доказнасць, абгрунтаванасць; адпаведнасць матэрыялу пастаўленай мэце; творчая, арыгінальная падача матэрыялу; лагічнасць і пісьменнасць прадстаўлення інфармацыі; тэхнічная рэалізацыя працы.

Конкурсныя работы прымаюцца да 15 лютага 2017 года па электронным адрасе: unik.npo@gmail.com. Урачыстае падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу адбудзецца вясной 2017 года.

### АБІТУРЫЕНТАМ У ДАПАМОГУ...

**Атлас сучаснай навуковай інфармацыі аб Зямлі ўпершыню выдадзены ў БДУ.**

Гэта комплекснае картаграфічнае выданне з фізіка-геаграфічным, палітычным і сацыяльна-эканамічным зместам. Яго аўтарамі з'яўляюцца супрацоўнікі геаграфічнага факультэта.

Атлас рэкамендаваны для падрыхтоўкі вучняў сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў да рэспубліканскіх і міжнародных алімпіяд, а таксама да паступлення на прыродазнаўчыя і эканамічныя спецыяльнасці. У ім сабрана мноства інфармацыйных і графічных матэрыялаў — карты, схемы, дыяграмы, табліцы і ілюстрацыі. Такія падрабязныя энцыклапедычныя звесткі дапамогуць зразумець асноўныя геаграфічныя заканамернасці, скласці ўяўленне аб прыродных кампанентах мацерыкоў, асобных рэгіёнаў і краін.

У рэцэнзаванні картаў атласа прынялі ўдзел навукоўцы, настаўнікі, члены Беларускага геаграфічнага таварыства.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# КУРСЫ З ДЫЯГНОСТЫКАЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Дома практычна немагчыма перавесці дух: сям'я, работа. А тут да абеду праходзім працэдуры, а пасля вучымся. Лекцыі чытаюць як навукоўцы, так і практыкі. Мы пабывалі ў агракамбінаце «Дзяржынскі», дзе нам паказалі, як трэба ўладкоўваць механічныя двары. У гаспадарцы «Радзіма Якуба Коласа» Стаўбцоўскага раёна пазнаёміліся з вопытам работы сваіх калег. Пасля заканчэння курсаў будзем здаваць экзамен і праходзіць тэсціраванне, — расказала **Марыя МАКАРЧУК, дырэктар адкрытага акцыянернага таварыства «Забашэвічы» Барысаўскага раёна.** На гэтую пасаду яе прызначылі пяць месяцаў таму.

***— З якімі цяжкасцямі сустрэліся як малады кіраўнік?*** — цікавімся ў яе.

— У кожнай гаспадарцы шмат праблем, але самая галоўная — фінансавая.

**Дырэктар сельскагаспадарчага кааператыва «Трайпл-Агра» Лагойскага раёна Дзмітрый ГРАМОВІЧ** усяго два гады, як узначаліў гаспадарку. За гэты час яму ўдалося павялічыць надой малака на карову ў паўтара раза. Сёлета гаспадарка павінна выйсці на паказчык у 8 тыс. кілаграмаў на кожную рагулю. У «Трайпле» самая высокая ў раёне ўраджайнасць збожжавых — 56 цэнтнераў з гектара. Спыніцца на дасягнутым амбіцыйны кіраўнік, як запэўнівае сам, не збіраецца.

Роўна год таму ў адкрытае акцыянернае таварыства «Вішнявецкі-агра» Стаўбцоўскага раёна прыйшоў Віктар Худніцкі. Тое, што ён не пабаяўся ўзяць на сябе адказнасць за самую праблемную гаспадарку, з вялікай крэдыторскай запазычанасцю, выклікае павагу.

**Галоўнае для залічэння ў кадравы рэзерв вобласці — гатоўнасць да адказнасці, жаданне вучыцца і ўдасканальвацца.**

Малады **дырэктар сельгаспрадпрыемства «Спадарожнік-Агра» Лагойскага раёна Юрый ВЕЛІНЕЦ** нарадзіўся ў звычайнай сялянскай сям'і: маці — аператар па адкорме буйной рагатай жывёлы ў СВК «Гервяты» на Гродзеншчыне, бацька — газаэлектразваршчык. Нядаўні выпускнік аграрнай вышэйшай навучальнай установы таксама застаўся працаваць у сельскай мясцовасці.

— Усё маё жыццё прайшло ў вёсцы. З дзяцінства марыў узначаліць гаспадарку. Гэта была не проста мара — наканаванне. І вось задума збылася. На гэтай пасадзе я ўжо амаль два гады. Работа вельмі падабаецца, не магу сябе ўявіць у іншай сферы. Тут нялёгка, але вельмі цікава. Я з тых людзей, хто не можа сядзець на месцы.

Арганізацыя, якую ўзначальвае Юрый Мікалаевіч, знаходзіцца на стадыі дасудовага аздараўлення.

— Мы прапрацоўваем усе магчымыя варыянты для адтэрміноўкі фінансавых абавязацельстваў перад крэдыторамі. На сённяшні дзень нам закрылі пратэрмінаваныя працэнты па банкаўскіх крэдытах. Арганізацыя цяпер зможа развівацца, яна нібы атрымала новае сэрца. Думаю, усё ў нас будзе добра, — кажа Юрый Велінец.

***— Як з галоўнымі спецыялістамі? Удалося сфарміраваць каманду?***

— Напачатку былі праблемы, а цяпер каманда прафесіяналаў у нас ёсць. Таму я спакойна сябе адчуваю на курсах. Тут даюць шмат у прафесійным плане, знаёмлюся з калегамі, з якімі давядзецца разам працаваць. Набыў веды па ўдасканаленні тэхналогій у раслінаводстве і жывёлагадоўлі, у пытаннях антыкрызіснага кіравання.

Такую форму работы з маладымі кіраўнікамі сельгасарганізацый і раёнаў увёў Сямён Шапіра, калі працаваў на пасадзе старшыні Гродзенскага аблвыканкама. Як паказвае час, апраўдала такая практыка сябе і на Міншчыне.

— Мы сабралі вас сюды, каб вы павучыліся, падумалі, падлячыліся, — звярнуўся да слухачоў Сямён Барысавіч. — Вы працуеце без выхадных: тут забалела, там закалола — таблетку глынулі і ўперад. Тут жа вы праходзіце дэталёвае медыцынскае абследаванне. Гэта дазваляе своечасова выявіць хваробу. Былі выпадкі, калі медыкі знаходзілі першапачатковую стадыю анкалогіі. Высвятлялася, што людзі перанеслі інфаркт на нагах. А самае галоўнае ў нашым жыцці — спыніцца і падумаць. Цяпер на гэта ў вас ёсць час.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# ХТО ВІНАВАТЫ Ў ДЗІЦЯЧАЙ АГРЭСІІ?

### Паасобку не папярэдзіць

— Узрасла колькасць учыненых дзецьмі асабліва цяжкіх і цяжкіх злачынстваў (з 17 да 29) у стане наркатычнага ап'янення (з 6 да 13), колькасць правапарушэнняў, здзейсненых у стане алкагольнага ап'янення — на ранейшым высокім узроўні (25 злачынстваў). Значна ўзрасла колькасць крымінальных спраў з удзелам непаўналетніх у Віцебску, Дубровенскім, Лепельскім, Полацкім раёнах. Больш зарэгістравалі групавых і рэцыдыўных парушэнняў закона, — канстатуе **выконваючы абавязкі пракурора Віцебскай вобласці Аляксандр СІДАРОВІЧ.**

У прыватнасці, хутка пачнецца суд над 7 хлопцамі. Ім інкрымінуецца здзяйсненне некалькі гадоў таму шэрагу злачынстваў, накіраваных на распальванне расавай нянавісці. Яны абвінавачваюцца ў тым, што збівалі замежных студэнтаў. Гэтым маладым людзям падабалася публічная дэманстрацыя нацысцкіх сімвалаў: тату, вітанняў.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Кіраўніцтва пракуратуры тлумачыць рост злачыннасці тым, што суб'екты прафілактыкі правапарушэнняў (камісіі па справах непаўналетніх, органы апекі і папячыцельства, упраўленні адукацыі, аховы здароўя, па працы і сацыяльнай абароне, унутраных спраў і іншыя) расслабіліся. У прыватнасці, не наладжаны абмен інфармацыяй аб асобах, якія ўцягваюць дзяцей у антыграмадскія паводзіны, аб праблемных падлеткавых групах.

### Бацькі як пагроза

Падчас тэматычнага каардынацыйнага пасяджэння ў аблвыканкаме адбылася няпростая размова. Заўвагі і прэтэнзіі ад пракурораў пачулі кіраўнікі розных узроўняў і ведамстваў.

— Злачыннасць сярод непаўналетніх — паказчык працы педагагічных калектываў. На жаль, даводзіцца ў літаральным сэнсе слова ратаваць дзяцей ад тых, хто павінен пра іх клапаціцца: прыходзіцца выхоўваць і бацькоў, — канстатаваў **Дзмітрый ХОМА, начальнік упраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама.**

Кіраўнікі праваахоўных органаў заклікаюць дырэктараў навучальных устаноў не ўтойваць негатыў. Напрыклад, трэба паведаміць у міліцыю пра дзяцей, якія ўжываюць наркотыкі. Тым больш пра факты іх распаўсюджвання. І трэба заахвочваць педагогаў за такую аператыўную прафілактычную работу.

**Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір ПЕНІН** падкрэсліў, што ў справе прафілактыкі правапарушэнняў не павінна быць фармалізму.

— Неабходна прафесійна высвятляць, як дзіця трапіла ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, — лічыць ён. — Заўсёды ёсць магчымасць нармалізацыі сямейнай абстаноўкі. У тым выпадку, калі неабходна дзяржаўная абарона, меры павінны прымацца неадкладна. Патрэбны дадатковыя меры па забеспячэнні абароны непаўналетніх ад усіх відаў эксплуатацыі і грубых адносін.

Сёлета за парушэнні адпаведнага заканадаўства ўнесены 460 актаў пракурорскага нагляду. Да дысцыплінарнай і адміністрацыйнай адказнасці прыцягнулі 470 вінаватых.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.** *pukshanski@zviazda.by*

■ Прэм'ера рубрыкі

# «ПОЛАЦКІ СШЫТАК»

**Газета «Звязда» сумесна з Інстытутам мовазнаўства імя Якуба Коласа НАН Беларусі распачынае новую рубрыку пад назвай «Полацкі сшытак». Не сакрэт, што ў наступным годзе мы будзем адзначаць 500-годдзе айчыннага кнігадрукавання, распачатага доктарам Францыскам Скарынам. Таму не выпадкова і Дзень пісьменства ў наступным годзе будзе праходзіць менавіта на малой радзіме першадрукара. Аднак гэта толькі адна, хоць і надзвычай яскравая старонка гісторыі Полаччыны. Самы час даведацца, чым яшчэ вядомая гэтая старажытная зямля?**

Загадчык аддзела дыялекталогіі і лінгвагеаграфіі, кандыдат філалагічных навук Вераніка Курцова раскажа пра лексічныя таямніцы Полаччыны. Напрыклад, можна будзе даведацца, «што яднае *п'яніца* і *ганаболі*?», «што смачней: *какора* ці *лапун*?» Будуць прааналізаваны адметныя гукавыя рысы гаворак Полаччыны — «як *аер* стаў *вернікам*», «блізкія ці далёкія сваякі *сачэнь* і *цацэнь*?» Уважліва будуць разгледжаны таксама сінтаксічныя рысы полацкіх гаворак, а таксама іх марфалагічныя адметнасці: «*чытае* ці *чытаець*, мы *ядзім* ці *ядзём*, сады *цвітуць* ці *цвіцяць*?»

Каго «мещане полоцкие» называлі «*велебнымъ*» і «*доброродн*ымъ»? Хто такія «*сестренець*» і «*дядьковичъ*»? Якія абавязкі меў «*ездокъ*»? Адказ на гэтыя і іншыя пытанні можна будзе знайсці ў артыкуле загадчыка аддзела гісторыі беларускай мовы, кандыдата філалагічных навук Наталлі Паляшчук «Палачанін Сярэднявечча праз прызму лексікі полацкіх дакументаў».

Наместнік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа, кандыдат філалагічных навук Сяргей Гаранін будзе прадстаўляць звесткі і меркаванні пра Полацкія летапісы. Можна будзе даведацца, чым звязаны «Слова пра паход Ігаравы» і Полаччына. «Іераманах Варсанофій — полацкі вандроўнік XV стагоддзя», «Пісьменства напярэдадні з'яўлення кнігадруку», «Паслядоўнікі Францыска Скарыны», «Паэзія ў Полацку ў XVII стагоддзі: Ігнацій Іяўлевіч і Філафей Утчыцкі», «Сімяон Полацкі і паэзія Барока» — гэтыя тэмы, без сумнення, могуць выклікаць цікавасць у чытачоў «Звязды».

Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута, кандыдат філалагічных навук Ірына Будзько раскажа пра першакнігу беларусаў — Полацкае Евангелле XII стагоддзя. Асабліва цікавым абяцае быць яе артыкул «Графіці Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра».

Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута, кандыдат філалагічных навук Эльвіра Ярмоленка прыадчыніць вядомыя і невядомыя старонкі «Жыція Еўфрасінні Полацкай».

Дырэктар Інстытута мовазнаўства Ігар Капылоў, па заведзенай і любімай нашымі чытачамі традыцыі, будзе разглядаць тапаніміку гэтага краю. Але цяпер увага даследчыка будзе звернута яшчэ і на адметныя прозвішчы палачан.

***Варта дадаць, што амаль усе з названых матэрыялаў будуць апублікаваны ў «Звяздзе» ўжо ў наступным годзе. Спадзяёмся, вы не забыліся аформіць падпіску.***

***Заставайцеся з намі — будзе цікава!***

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**
*nina@zviazda.by*
*Карэліцкі раён*

■ Рупліўцы спадчыны

# «ГУСТ, ВЫХАВАНЫ НА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЯХ...»

## У Мірскім мастацкім каледжы адраджаюць старажытныя рамёствы



**Мірскі мастацкі прафесійна-тэхнічны каледж — гэта асаблівы свет. Тут можна не проста атрымаць пэўныя працоўныя навыкі, але кожны дзень жыць у судакрананні са старажытнымі беларускімі рамёствамі — роспісам, разьбой па дрэве, ганчарствам і многімі іншымі. Музей з работамі навучэнцаў — сапраўдная галерэя аўтэнтычнай беларускай культуры. Бо тое, што зроблена рукамі маладых людзей, адпавядае традыцыям, якія здаўна бытавалі на гэтых землях або былі даскanала вывучаны ў іншых рэгіёнах Беларусі. Тут дзейнічае батлеечны тэатр, які ствараюць самі студэнты разам з выкладчыкамі. Хочацца дадаць, што кожны навучэнец каледжа, які прыязджае ў Мір, гарантавана атрымлівае месца ў інтэрнаце, а таксама бясплатны гарачы абед. Падаецца, гэту навучальную ўстанову ў пэўным сэнсе можна назваць ідэальнай... Карэспандэнт «Звязды» сустрэлася з наместнікам дырэктара па вучэбнай рабоце мірскага каледжа Канстанцінам ПЕТРЫМАНАМ, каб распытаць, як удаецца старажытныя мясцовыя рамёствы ўплятаць у сучасную вучэбную праграму і такім чынам адраджаць традыцыйную культуру.**

«І ў Міры, і ў вёсцы Сімакава, якая размяшчаецца непадалёк, была знакамітая школа разьбы па дрэве і сталярных работ, — адзначае Канстанцін Петрыман. — Нашы сённяшнія ўменні базіруюцца на іх традыцыях. Тагачасныя майстры атрымлівалі заказы нават з Луўра, з Вестмінстэра!

Вялікі штуршок для развіцця іх рамяства далі радзівілаўскія мануфактуры — калісьці Мір уваходзіў у склад Нясвіжскай ардынацыі гэтага магнацкага роду. Дзякуючы намаганням Мікалая Радзівіла Сіроткі і Ганны Катажыны Радзівіл тут працавалі сур'ёзныя мануфактуры. Адгалосак іх працы ішоў аж да часоў рэвалюцыі, якая не здолела «пахіснуць» развіццё гэтых рамёстваў. У 1920—1930-я гады ў Міры працавалі вядомыя сталярныя майстэрні Івана Хмеля. Аўтэнтычную мэблю, вырабленую ў іх, сёння можна ўбачыць у экспазіцыі Мірскага замка».

Калісьці тут бытавала і адметная школа керамікі, вядомая яшчэ з XV стагоддзя. У экспазіцыі музея мірскага каледжа можна ўбачыць рэканструкцыю тых прадметаў, якія на сённяшні дзень ужо вельмі складана адшукаць. Адметны прыклад — міска-цадзілак. На яе нанесена асаблівая фляндроўка (хвалісты ўзор), характэрная толькі для ваколіц Міра. Яе стваралі майстры Бычко і Нярверка. Такая фляндроўка ў пэўным сэнсе была іх таварным знакам. Яе ўмеюць рабіць і сённяшнія навучэнцы каледжа.

«У нашай мясцовасці шмат адметных храмаў, — працягвае Петрыман. — Царква Георгія Пабеданосца, Святой Тройцы, касцёл Святога Мікалая Цудатворцы, царква-пахавальня князёў Святаполк-Мірскіх. Гэта старадаўнія будынкі, у якіх захаваліся рэчы, што маюць доўгую гісторыю. Нашы дзеці і майстры вывучалі, як створаны іх разныя іканастасы. Пэўныя матывы цяпер выкарыстоўваюць у сваёй творчасці.

Часам пры рэстаўрацыі, калі вычышчаецца тая ці іншая тэрыторыя, у друзе трапляюцца рэшткі лепкі, кавалачкі з нанесенай драўлянай разьбой. Іх можна забраць. Так аднаўляецца цэлы ўзор — пэўнай дэталі, іканастаса ці аздаблення памяшкання». Цяпер у каледжы вядзецца работа над інавацыйным праектам вывучэння традыцыйных школ роспісу. Збіраюцца звесткі з розных мясцін. Напрыклад, вёска Мокрая Дуброва, што на Піншчыне, была знакамітая сваімі распіснымі куфрамі. Плануецца паездка туды для вывучэння адметных узораў.

Будзе разгледжаны і прынёманскі кірунак роспісу — Гарадзеншчына, Шчучын, Ліда. Нядаўна



знайшоўся чалавек са Шчучына, які мае вялікую калекцыю саматканых дываноў. На іх вельмі адметны арнаментальны ўзор, які таксама будзе даследаваны.

Цікава, што ў музеі мастацкага каледжа вельмі шмат шахмат. Яны зроблены з самых розных матэрыялаў з выкарыстаннем адметных тэхнік. «Наш каледж быў заснаваны ў 1988 годзе. У пачатку 1990-х майстры і навучэнцы знайшлі звесткі пра ганчара, які вырабляў вельмі характэрныя цацкі, — працягвае расказваць Канстанцін Леанардавіч. — У выглядзе сланоў, насарогаў, ільвоў, кароў, быкоў. Гэтыя фігуркі былі па-свойму адметнымі. На жаль, рэчаў, зробленых ім самім, адшукаць не ўдалося. Але па ўспамінах, якія засталіся, майстры і навучэнцы каледжа аднавілі гэтыя цацкі. Вырашылі зрабіць іх у выглядзе шахмат, бо сярод такіх фігур магчыма вялікая разнастайнасць».

На пытанне, як удалося мясцовыя традыцыі так гарманічна ўплесці ў вучэбны працэс, Канстанцін Петрыман адказвае:

— Гэта стала магчымым дзякуючы нашым выкладчыкам — тым людзям, якія не крычаць гучна аб сваёй працы, але займаюцца ўзнаўленнем спадчыны. І гэта стала справай іх жыцця і гонару. Мы заўсёды кажам дзецям, што вывучаем нашу з імі краіну: даследуем яе набыткі, з'яўляемся прадаўжальнікамі таго, што стварылі продкі. Мы не проста вывучаем, як правільна вырабляць керамічны посуд ці пэўныя дэкаратыўныя элементы, але найперш працягваем справу прадзедаў. І дзеці разумеюць гэта. Мы ганарымся тым, што нашы выпускнікі — добрыя спецыялісты, адданыя працаўнікі. Яны маюць выдатны густ, выхаваны на нацыянальных традыцыях. Сапраўдны патрыёт, які цэніць сваю культуру, ніколі пра іншых не скажа нічога дрэннага. Бо культура народа — самы вялікі здабытак.

Вучэбны працэс у мірскім каледжы прадугледжвае засваенне дзецьмі пэўных мастацкіх прыёмаў. А якія менавіта з іх выбіраць, вырашаюць самі майстры. Вельмі каштоўна, што яны знаходзяць час, каб не толькі даць праграмныя рэчы, але і падзяліцца ведамі пра нацыянальную культуру. Таксама дзейнічаюць гурткі — мастацкага роспісу, разьбы па дрэве — там творчым памкненням даецца поўная свабода. У Рэспубліканскім інстытуце прафесійнай адукацыі вельмі станоўча ставяцца да інавацыйных праектаў, якія распрацоўваюць у Міры. Калі работа над праграмай беларускага нацыянальнага роспісу будзе завершана, яе ўключаць у абавязковае вывучэнне. «Мы ўсе цяпер знаходзімся ў творчым пошуку, — рэзюмуе Петрыман. — Здаецца, усё вывучана ўвогуле. Але ж яшчэ цэлы пласт работы па вывучэнні дэталяў...»

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*
*Карэліцкі раён*

■ Старонкі мінуўшчыны

## 500 гадоў таму выйшла «Пруская вайна» Яна Вісліцкага

# «Беларусіны яшчэ, вельмі слаўныя мужнасцю ў войнах»

**Праз 100 гадоў пасля векапомнай Грунвальдскай бітвы, у пачатку XVI стагоддзя Тэўтонскі ордэн ізноў актывізаваў сваю агрэсіўную палітыку. Вялікі магістр Альбрэхт Гогенцолерн, узброіўшыся супраць свайго дзядзькі, караля і вялікага князя Жыгімонта Першага, рыхтаваўся да новай Прускай вайны — так гаварылі сучаснікі, бо бітва з крыжакамі пад Грунвальдам у 1410 годзе атрымала ў тагачаснай гістарыяграфіі такую назву.**

Гэтую ж назву выбраў паэт-гуманіст Ян Вісліцкі для свайго паэтычнага зборніка лацінамоўных твораў, які пабачыў свет у Кракаве ў 1516 годзе. Беларускія даследчыкі схіляюцца да думкі, што Ян Вісліцкі мог быць ураджэнцам беларускага мястэчка Вісліца на ўзбярэжжы аднайменнай ракі. Само мястэчка не захавалася, на жаль, у вірах шматпакутнай гісторыі Беларусі, але Вісліца (рака ў Пінскім і Івацэвіцкім раёнах) і да сённяшняга дня коціць свае блакітныя воды.

Цэнтральнае месца ў зборніку «Пруская вайна» займае аднайменная паэма, якая складаецца з трох частак (кніг). У першай кнізе аўтар расказвае пра той край, які з антычных часоў быў вядомы як


Bellū Prutenū

Тытульны аркуш кнігі 1516 года.

Сарматыя, — так, маўляў, назваў гэтую краіну недасведчаны сусед. Тым часам мясцовыя жыхары далі сваёй Айчыне назву Палонія, якую, зыходзячы з кантэксту паэмы, ніяк нельга атаясамліваць з сучаснай Польшчай. Тут, у Палоніі, піша Ян Вісліцкі, жыве не толькі «люд, што сябе на мове спрадвечнай палякамі кліча». «Тут распасцерліся землі траякіх русінаў», — зазначае ён. Дасведчанаму чытачу няцяжка было зразумець, што гаворка ідзе пра так званых «белых, чорных і чырвоных русінаў», — менавіта так з часоў Сярэднявечча называлі продкаў сённяшніх усходніх славян. Расказаўшы пра першых легендарных валадароў Палоніі — Леха, Крака і Ванду, — Ян Вісліцкі спыняе далейшы генеалагічны аповед (так параіў яму апякун мастацтваў Апалон), і ў другой кнізе адразу згадвае вялікага князя і караля Ягайлу, пачаўшы з маляўнічага апісання яго Радзімы — Вялікага Княства Літоўскага:

*Ёсць нязведаны край,*
*славуты сваімі лясамі,*
*Ён уладанні шырока раскінуў*
*да скіфскіх прастораў;*
*Плодны, квітнее лугамі,*
*цячэ ў ім струмень меданосны;*
*Край на народы багаты,*
*таксама й на вояў адважных.*

Неўзабаве чытач атрымлівае магчымасць даведацца пра самі народы, над якімі Ягайла ўсталяваў сваю ўладу. Першымі паэт называе тартараў (татар), следам за імі — масагетаў (жамойтаў). Нарэшце з'яўляюцца «беларусіны яшчэ, вельмі слаўныя мужнасцю ў войнах». Чаму менавіта гэтае ўпамінанне белых русінаў мае асаблівае значэнне? «Пруская вайна» была паэмай, напісанай па ўсіх канонах класічнага гераічнага эпасу. На падставе такіх паэм — «Іліяды» Гамера, «Энеіды» Вергілія — шматлікія чытачы фарміравалі свае ўяўленні пра веліч былых цывілізацый. І менавіта ў межах такога твора яшчэ ў пачатку XVI стагоддзя былі згаданы беларусы.

Прапанаваўшы ў другой кнізе «Прускай вайны» сваю мастацкую інтэрпрэтацыю перадгісторыі і гісторыі Грунвальдскай бітвы, Ян Вісліцкі пачынае трэцюю кнігу сцэнай нарады багоў на Алімпе: Юпітэр радзіцца з іншымі багамі, каго аддаць за жонку сівавалосаму каралю Ягайлу, які ўсё яшчэ не дачакаўся спадкаемца ўлады. Абранніцай багоў стала «найпрыгажэйшая ў свеце дзяўчына» — маладая князёўна Соф'я з роду беларускіх князёў Гальшанскіх. Дзякуючы ёй пачалася слаўная гісторыя дынастыі Ягелонаў. Усхваляючы караля Ягайлу ў канцы другой кнігі, Ян Вісліцкі не жадае прыпадабняць яго да сусветна вядомых герояў антычных часоў — Ахіла, Гектара або Цэзара. Паэт эпохі Рэнесансу з далёкага 1516 года даводзіць нам, сваім нашчадкам, што айчынныя героі — непараўнальныя, айчынная гісторыя — унікальная і непаўторная, як сам родны край.

**Жанна НЕКРАШЭВІЧ-КАРОТКАЯ.**

■ Экспертная сустрэча

# МІГРАЦЫЯ: ПЫТАННЕ АГУЛЬНАСУСВЕТНАГА ЗНАЧЭННЯ

## У Мінску адбыўся тэматычны міжнародны форум

**Сярод удзельнікаў — прадстаўнікі кампетэнтных органаў Рэспублікі Беларусь, дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза і Усходняга партнёрства, а таксама эксперты з Азербайджана, Арменіі, Венгрыі, Грузіі, Даніі, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Украіны і розных міжнародных арганізацый. Асноўная ўвага падчас сустрэчы ўдзялялася распрацоўцы актуальных на цяперашні момант міграцыйных стратэгій, у тым ліку і шляхам абмену вопытам і аналізу эфектыўнасці нацыянальных практык.**

У 2011 годзе была створана Панэль па пытаннях міграцыі і прыстанішча Усходняга партнёрства для спрашчэння пабудовы дыялогу паміж усходнімі партнерамі і Еўрапейскім саюзам. Гэты форум з'яўляецца важным этапам ва ўмацаванні наладжаных за згаданы перыяд сувязяў.

Як адзначыў **намеснік міністра ўнутраных спраў Мікалай МЕЛЬЧАНКА,** Беларусь не сутыкнулася з хваляй масавай міграцыі, якія зараз накрылі Еўропу. У нашай краіне добра пабудавана сістэма, якая дазваляе спыняць каналы незаконных перасяленняў. Тым не менш геаграфічнае становішча дзяржавы абавязвае быць гатовымі да тых выклікаў, якія кінутыя краінам ЕС. На гэты момант найбольшую цікавасць Рэспубліка Беларусь уяўляе ў якасці транзітнага калідора для мігрантаў, якія рухаюцца ў Заходнюю Еўропу.

Сёлета органамі ўнутраных спраў ва ўзаемадзеянні з партнёрамі з іншых ведамстваў было выяўлена 15 каналаў незаконнай міграцыі. Затрымана каля 80 чалавек, большасць з іх — выхадцы з В'етнама, Ірака і Бангладэш.

Па словах **дырэктара Міжнароднай арганізацыі па міграцыі па Паўднёва-Усходняй Еўропе, Усходняй Еўропе і Цэнтральнай Азіі Аргенціны САБАДОШ,** нельга меркаваць, што пытанні міграцыі можна вырашаць асобна на ўзроўні краіны ці нават рэгіёна. Іх варта разглядаць у глабальным кантэксце. Таму значнасць міжнародных форумаў нельга недаацэньваць: гэта не проста абмеркаванне асабістых поглядаў, а фарміраванне агульнай канцэпцыі. Ужо цяпер відавочныя найбольш спрэчныя моманты, напрыклад, пошук балансу паміж забеспячэннем нацыянальнай бяспекі і абароненасцю жыцця асобных людзей. Калі чалавек з'яўляецца бежанцам, яму неабходны асаблівы ўзровень аховы. У дачыненні да мігрантаў неабходна памятаць пра тое, што ў іх таксама, як і ва ўсіх астатніх людзей, ёсць неад'емныя правы чалавека, якія неабходна выконваць.

**Кіраўнік дэлегацыі ЕС у Рэспубліцы Беларусь Андрэа ВІКТАРЫН** расказала, што форум з'яўляўся апошнім сёлета, выніковым, пасяджэннем Панэлі па пытаннях міграцыі і прыстанішча. 13 кастрычніка было падпісана новае пагадненне Еўрапейскага саюза з Беларуссю аб партнёрстве ў сферы мабільнасці, што дазволіла актывізаваць работу па пытаннях міграцыі, якія ў 2016 годзе былі прыярытэтнымі. Самай вялікай складанасцю для Еўрапейскага саюза сталася негатоўнасць да такога вялізнага патоку мігрантаў, таму ў найбліжэйшы час неабходна выпрацаваць адзіную стратэгію дзеянняў. Гэта датычыцца і нарматыўна-прававой базы, і сацыяльных аспектаў. Не варта забываць, што мігранты ў большасці сваёй — гэта псіхалагічна траўмаваныя людзі, якія прабываюць у Еўропу з рэгіёнаў, ахопленых канфліктам.

— У Беларусі знаходжуся ўжо год. І я была прыемна здзіўленая тым, як апаратыўна краіна адрэагавала на тыя 160 тысяч мігрантаў, якія прыехалі з Украіны. Акрамя таго, відавочна, што за апошні час адносіны паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам прыкметна палепшыліся: з візітам краіну наведалі шматлікія міжнародныя дэлегацыі, аб'ём дапамогі ёй быў павялічаны ў два разы. Аднак перспектывы развіцця супрацоўніцтва яшчэ вельмі шырокія, — падвяла вынік Андрэа Віктарын.

У сваю чаргу **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Літоўскай Рэспублікі ў Беларусі Андрус ПУЛОКАС** падкрэсліў, што зараз вядуцца перамовы аб спрашчэнні візавага рэжыму паміж нашай дзяржавай і Еўрапейскім саюзам. Адзін з кірункаў — зніжэнне кошту консульскага збору. Дарэчы, гэты год стаў рэкордным па колькасці віз, выдадзеных пасольствам Літоўскай Рэспублікі ў Мінску: усяго больш за 10 тысяч.

На 2017 год Міністэрствам унутраных спраў Беларусі запланавана распрацоўка Канцэпцыі нацыянальнай міграцыйнай палітыкі. Змест дакладаў, агучаных на экспертнай сустрэчы, а таксама рэкамендацыі і вопыт калег з іншых краін могуць стаць зыходным пунктам для яе фарміравання.

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*



■ Служба міласэрнасці

# СІЛА ДОБРАЙ ВОЛІ

## У нас пакуль няма закона «Аб валанцёрстве», аднак велізарны аб'ём сацыяльнай работы па-ранейшаму выконваюць добраахвотнікі

**Узяць, напрыклад, дзейнасць Беларускага Таварыства Чырвонага Крыжа — дапамогу сацыяльна ўразлівым людзям, догляд дома, гуманітарную дапамогу, рэагаванне на крызісныя сітуацыі і надзвычайныя здарэнні... Як справіцца з такімі задачамі без людзей, здольных за адно толькі «дзякуй!» горы звярнуць? Вось і атрымліваецца: больш за 22 тысячы валанцёраў — толькі ў адной гэтай арганізацыі — могуць так звацца ўмоўна. Тым часам яны навучаюць насельніцтва асновам аказання першай меддапамогі, уваходзяць у склад атрадаў хуткага рэагавання, Службу сясцёр міласэрнасці.**

Апошняя — гэта комплексная падтрымка пажылых і старых людзей у іх дома, індывідуальны догляд, медыцынская, сацыяльная, бытавая дапамога. Штогод дома аказваецца каля 1 мільёна паслуг для больш чым тысячы падапечных, яшчэ каля 12 тысяч атрымліваюць дапамогу ў размешчаных па ўсёй краіне 40 цэнтрах медыка-сацыяльнай дапамогі. Як тут без добраахвотнікаў, здольных і словам, і паходам у краму падтрымаць бездапаможных хворых, чый сярэдні ўзрост каля 82 гадоў? З другога боку, ядро службы — 147 прафесійных сясцёр міласэрнасці, з якімі некалі таксама было ўсё няпроста. Ад самага пачатку стварэння арганізацыі гэта катэгорыя атрымлівала заробак, але...

«Некалі дзяржава фінансавала зарплату медсясцёр міласэрнасці, і гэта было каля тысячы ставак, — заўважае **менеджар аднаго з праектаў таварыства Таццяна СВЯТЛОВІЧ.** — Аднак пасля 2000 года скарацілася дзяржаўнае фінансаванне ўсіх грамадскіх аб'яднанняў, а за кошт членскіх узносаў і ахвяраванняў амаль немагчыма трымаць такі штат работнікаў. Таму колькасць медсясцёр значна зменшылася. Праблему аказання медыка-сацыяльнай дапамогі дома вырашыла прыняцце закона «Аб сацыяльным абслугоўванні», калі ўдалося ўкараніць механізм дзяржаўнага сацыяльнага заказу, прыцягнуць недзяржаўныя некамерцыйныя арганізацыі да аказання сацыяльных паслуг з забеспячэннем частковага фінансавання з мясцовых бюджэтаў. І мы сталі піянерамі ў апрабацыі гэтага механізма». У апошнія гады колькасць дагавораў, якія заключаюць мясцовыя выканаўчыя органы з грамадскімі арганізацыямі, расце. У 2013 годзе быў заключаны толькі адзін пробны дагавор у Гродне, у 2014-м — ужо 21, 2015-м — 31, сёлета — 49, і каля сарака з іх адносяцца да Беларускага Чырвонага Крыжа.



Без валанцёрскага руху немагчыма ўявіць і работу атрадаў хуткага рэагавання. «У 2012-м мы працавалі ва ўмовах нізкіх тэмператур на дарогах, — першымі наладзілі патруляванне для дапамогі аўтамабілістам, і пасля дзяржава пераняла ў нас гэты вопыт, — прыгадвае **кіраўнік стратэгічнага кірунку «Падрыхтоўка і рэагаванне на надзвычайныя і крызісныя сітуацыі» таварыства Дзмітрый РУСАКОЎ.** — У 2013-м удзельнічалі ў ліквідацыі наступстваў паводкі — гэта была і гуманітарная дапамога, у тым ліку забеспячэнне ежай, і псіхалагічная падтрымка, за што людзі былі нам удзячныя не менш».

У межах чарнобыльскай Праграмы гуманітарнай дапамогі і рэабілітацыі таварыства ажыццявіла самую доўгатэрміновую праграму, якая доўжылася больш як 20 гадоў. Перасоўныя дыягнастычныя лабараторыі Чырвонага Крыжа штогод абследавалі дзясяткі тысяч чалавек у забруджаных раёнах Магілёўскай, Гомельскай і Брэсцкай абласцей. Штогод выяўляліся такім чынам да 200 выпадкаў паталогіі шчытападобнай залозы.

Значная частка праектаў Чырвонага Крыжа скіравана на аказанне сацыяльнай і медыцынскай дапамогі ў тым ліку замежнікам, якія пражываюць на тэрыторыі краіны. Напрыклад, грамадзянам Украіны. Каля 900 чалавек з іх маюць статус бежанца, і яны прыраўнаны ў правах да грамадзян Беларусі. Яшчэ каля 1600 чалавек маюць дадатковую абарону. Паводле слоў **намесніка генеральнага сакратара БТЧК Іны ЛЕМЯШЭЎСКАЙ,** гэтым людзям прадастаўляюцца бясплатныя медпаслугі, сацыяльная падтрымка. Аднак не ўсе грамадзяне Украіны звярталіся па такія статусы. Многія афармляюць часовае пражыванне (на сёння зарэгістраваліся каля 55 тысяч), а пастаянна прыжывае больш за 33 тысячы. Для падтрымкі грамадзян з Данецкай і Луганскай абласцей з 2014 года было прыцягнута каля 2,8 млн долараў. Яшчэ каля 100 тысяч дэнамінаваных рублёў беларусы ахвяравалі на разліковы рахунак таварыства для аплаты медпаслуг грамадзянам Украіны.

У свой час 196 дзяржаў, у тым ліку і наша краіна, падпісалі дакументы па міжнародным гуманітарным праве, звязаным з абаронай ахвяр падчас узброеных канфліктаў.

— Мы вядзём работу па прызнанні рускай мовы пятай афіцыйнай мовай руху, што дапаможа яшчэ больш актыўна праяўляць сябе на міжнародным узроўні, — кажа **начальнік аддзела міжнародных адносін БТЧК Кацярына ЛЯЛЕКА.** — У наступныя чатыры гады бяром на сябе абавязкі забяспечваць навучанне гуманітарным каштоўнасцям, аказваць падтрымку ахвярам гандлю людзьмі ў Еўропе і прыцягваць моладзь да валанцёрства. Мы не толькі атрымліваем міжнародную дапамогу, але і самі не застаёмся ў баку падчас надзвычайных здарэнняў у свеце: дапамагалі пацярпелым ад бедстваў Японіі, Кубані, у Балканскім рэгіёне і Непале. Аб'яўлялі збор сродкаў па краіне, выдаткоўвалі грошы з рэзервовага фонду. Мы вельмі ўдзячныя за падтрымку і супрацоўніцтва таварыствам Чырвонага Крыжа Аўстрыі, Даніі, Ісландыі, Нарвегіі, Швейцарыі, ЗША і Японіі. Уявіце толькі, як жанчыны з Даніі ці Ісландыі вяжуць адзенне для нашых грамадзян: яны абавязкова цікавяцца, для якога ўзросту патрэбна адзенне, якія мадэлі ў нас любяць насіць... А жыхары Швейцарыі набываюць прадукты, цацкі, сувеніры і адпраўляюць у Беларусь для таго, каб нейкая сям'я магла крыху сэканоміць і набыць, напрыклад, неабходныя вітаміны...

А пачыналася ўсё 95 гадоў таму — з дапамогі параненым воінам і ваеннапалонным, стварэння пазней лазарэтаў, пунктаў харчавання і абагрэву. У 1995 годзе Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа далучылася да міжнароднай федэрацыі таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. «Наш асноўны прынцып — гуманнасці — мае на ўвазе садзейнічанне дзяржаве ў тым, каб чалавек, які трапіў у бяду, а гэта можа быць ваенны канфлікт ці нейкая прыродная катастрофа, не застаўся з ёю сам-насам, — адзначае **генеральны сакратар БТЧК, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вольга МЫЧКО.** — Аднак большая частка нашай работы адбываецца ў мірны час, калі трапіўшы ў сур'ёзную крызісную сітуацыю, чалавек таксама можа разлічваць на падтрымку».

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

# КАРАНІ І КРОНЫ

7

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя № 7 (15)


# НЕПРЫРУЧАНЫ ДЗІКІ НІКАР,

## або Як вярнуць ваду балотам?

**Напрыканцы лістапада адбылася падзея, якую некаторыя эколагі ўжо назвалі падзеяй года — дадзены старт па забалочванні часткі асушанага ў канцы 50-х гадоў мінулага стагоддзя балота Дзікі Нікар, што ў Белавежскай пушчы. У мерапрыемстве прынялі ўдзел прадстаўнікі Франкфурцкага заалагічнага таварыства (Германія), Белавежскага нацыянальнага парка (Польшча), Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» (Беларусь), Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, грамадскіх арганізацый «Ахова птушак Бацькаўшчыны» і «Багна», прадстаўнікі мясцовых улад, спецыялісты-інжынеры, эколагі.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### НІКАР — БАГАЦЦЕ ПУШЧЫ

Асушанае балота Дзікі Нікар займае больш за 7 тыс. га, паўторнае забалочванне будзе праводзіцца на 1163,7 га. Чаму для ажыццяўлення праекта спецыялісты выбралі менавіта гэтую тэрыторыю?

- Дзікі Нікар павінен стварыць своеасаблівы ахоўны буфер паміж рэліктавымі лясамі і меліярыраванымі землямі.
- Гэта балота з захаваным тарфянікам, таму расліны, якія раслі там да асушэння, адновяцца значна хутчэй, што паспрыяе аднаўленню ўсёй экасістэмы тэрыторыі.
- Тут захаваліся 19 дрэў піхты белай (занесенай у Чырвоную кнігу) ва ўрэчышчы Цісоўнік. Вакол яго будзе створаная свая ахоўная зона для падтрымання адпаведнага гідралагічнага рэжыму.
- Эколагі чакаюць, што пасля забалочвання на Дзікі Нікар вернуцца бабры і рэдкія віды птушак, такія як дупель, вяртлявая чаротаўка.

Раней 30% усёй тэрыторыі Белавежскай пушчы займалі балоты. Пасля савецкай меліярацыі 50—60-х гадоў было асушана амаль 20 тыс. га. Як вынік — дэградацыя экасістэм. Месцамі ўзровень грунтавых водаў знізіўся да 1,5 м. На працягу апошніх дваццаці гадоў тут знікаюць яловыя насаджэнні (на польскай тэрыторыі пушчы таксама), бо яны больш запатрабавальныя да вільгаці. Забалочванне — неабходная мера, якая будзе садзейнічаць паляпшэнню парушанага гідралагічнага рэжыму, назапашванню вады. Мясцовыя жыхары вітаюць аднаўленне балота, бо многія памятаюць, якім Дзікі Нікар быў у іх дзяцінстве, наколькі багатая і разнастайная тады была прырода.

**Віктар ФЯНЧУК, каардынатар прыродаахоўнага праекта для Белавежскай пушчы,** засярodзіў увагу на тым, што пачатку работ па забалочванні папярэднічалі амаль чатыры гады працы. Усё пачалося ў 2013 годзе з распрацоўкі навуковага абгрунтавання. Была праведзена ацэнка ўплыву планаваных работ, распрацаваны інжынерны праект, які прайшоў сур'ёзную экалагічную экспертызу. Таксама былі праведзены даследаванні арнітафаўны і дадзена папярэдняя ацэнка ўплыву на клімат: наколькі мы зможам скараціць выкіды парніковых газаў? За гэты час было затрачана каля 75 тыс. еўра.

### ТАННА І ЭФЕКТЫЎНА

Праекту паўторнага забалочвання асушанага балота Дзікі Нікар папярэднічалі яшчэ 10 пілотных праектаў такога кшталту — летась была прынята пастанова Савета Міністраў, якая зацвердзіла Стратэгію захавання і рацыянальнага (устойлівага) выкарыстання тарфянікаў і Схему размеркавання тарфянікаў па кірунках выкарыстання на перыяд да 2030 года. Была праведзена інвентарызацыя ўсіх балот Беларусі, якая паказала, што ў натуральным стане засталося толькі 863 тыс. га балот. На іх торф здабываць не будуць. Гэта дазволіць захаваць больш за 7 млрд $м^3$ прэснай вады і забяспечыць устойлівае воднае насычэнне рэк і азёр. Торф працягнуць здабываць, але толькі на ўжо парушаных тарфяніках. Парушаныя балоты, якія больш не выкарыстоўваюцца для сельскагаспадарчых патрэб, належаць экалагічнай рэабілітацыі.

***(Заканчэнне на 9-й стар.)***

■ Кліматычны баланс

# Калі цяпло — на пагібель

## Што неабходна зрабіць Беларусі для рэалізацыі палажэнняў Парыжскага пагаднення

COP21·CMP11 PARIS2015 UN CLIMATE CHANGE CONFERENCE

**Амаль уся дзейнасць сучаснага чалавека (татальная ўрбанізацыя, высяканне лясоў, сельская гаспадарка, прамысловасць, спажыванне прыроднага паліва, выпрацоўка энергіі, транспарт) выклікае выкіды парніковых газаў, якія ўтвараюць так званы парніковы эфект. Як вынік — на Зямлі павышаецца тэмпература, пачынаюць раставаць ледавікі, падымаецца ўзровень Сусветнага акіяна. Глабальны характар змянення клімату патрабуе максімальна шырокага супрацоўніцтва ўсіх краін і іх эфектыўнай дзейнасці. Іншага выйсця ў чалавецтва няма. Таму сёння паміж краінамі падпісваюцца пагадненні аб скарачэнні выкідаў, абароне навакольнага асяроддзя. Беларусь у гэтым кірунку не адстае ад развітых краін, актыўна пазіцыянуе сябе на сусветнай экалагічнай арэне.**




### «Інвентарызацыя» паветра

Пасля далучэння Беларусі да Парыжскага пагаднення ў краіне неабходна распрацаваць новыя дакументы, якія дазволяць у будучым правесці шэраг экалагічных мерапрыемстваў. Беларускія і еўрапейскія палітыкі, эколагі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый у Мінску селі за «круглы стол» (у межах сумеснай працы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і праекта Clima East, фінансуемага Еўрапейскім саюзам), каб акрэсліць межы будучых планаў па рэалізацыі пагаднення.

**Вольга Вавілонская, спецыяліст БелНДЦ «Экалогія»,** адзначыла, што ў краіне створана і актыўна працуе нарматыўна-прававая база, неабходная для рэалізацыі кліматычных пагадненняў. Нашы спецыялісты распрацоўваюць праграмы і меры для зніжэння выкідаў парніковых газаў, праграмы па адаптацыі і інш. Створана структура разам з групай нацыянальных экспертаў, якая прадстаўляе справаздачы па кліматычных пагадненнях.

БелНДЦ «Экалогія» — цэнтр, які ажыццяўляе інвентарызацыю парніковых газаў Беларусі (для гэтага быў створаны Кадастр парніковых газаў), праводзіць навуковыя даследаванні. У цэнтры працуе міжведамасная рабочая група па праблеме змянення клімату. Спецыялістамі цэнтра распрацавана сістэма адкрытага доступу да інфармацыі па пытаннях змянення клімату для насельніцтва. Міжнародныя эксперты праводзяць штогадовыя праверкі такіх дакументаў.

Важна, што меры, якія патрабуюцца для вырашэння праблем змянення клімату, будуць найбольш эфектыўнымі з экалагічнага, сацыяльнага і эканамічнага пунктаў гледжання ў тым выпадку, калі яны будуць заснаваныя на адпаведных навуковых, тэхнічных і эканамічных ведах і будуць пастаянна пераглядацца ў святле новых даных, атрыманых у гэтых галінах.

### Першыя крокі да Парыжа

На працягу двух дзён работы «круглага стала» разглядаліся стратэгічныя падыходы па рэалізацыі Парыжскага пагаднення, пытанні па распрацоўцы дарожнай карты, развіцця ўзнаўляльнай энергетыкі, фінансавання і іншыя.

**Ірына РУДЗЬКО, кансультант упраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Мінпрыроды,** паведаміла пра праект плана па рэалізацыі Парыжскага пагаднення ў Беларусі. Над яго стварэннем будуць працаваць спецыялісты Мінпрыроды, Мінэканомікі, Мінфіна, Мінпрама, Мінэнерга, Белстата, Акадэміі навук, аблвыканкамаў і інш. Плануецца распрацаваць:

— стратэгію доўгатэрміновага развіцця з нізкім узроўнем выкідаў парніковых газаў да 2050 года;

— нацыянальны план дзеянняў па павелічэнні абсорбцый парніковых газаў да 2030 года;

— праект нарматыўна-прававога акта аб падрыхтоўцы і зацвярджэнні нацыянальна вызначанага ўкладу Беларусі (на нашу краіну прыпадае 0,24% сусветных парніковых газаў);

— нацыянальны план дзеянняў у галіне адаптацыі да змянення клімату;

— стратэгію ўдзелу Беларусі ў фінансавых механізмах Парыжскага пагаднення;

— мерапрыемствы па ўдасканаленні інфармацыйнага забеспячэння падрыхтоўкі кадраў, мерапрыемствы па развіцці навуковых ведаў аб праблеме змянення клімату;

— нацыянальную справаздачнасць (кадастры, даклады, нацыянальныя паведамленні і г.д.).

У групу па распрацоўцы плана ўключаны і грамадскія арганізацыі (нагадваем, што любы экалагічны дакумент, згодна з сучасным заканадаўствам, узгадняецца з грамадскасцю і знаходзіцца ў адкрытым доступе на афіцыйных сайтах). Спецыялістаў розных сфер чакае вялікая і адказная праца. Астатнім застаецца сачыць за зменамі і спадзявацца на паспяховую рэалізацыю гэтага амбіцыёзнага плана.

**Clima East — рэгіянальны праект тэхнічнай дапамогі па падтрымцы дзеянняў, накіраваных на зніжэнне ўплыву чалавека на клімат у краінах Усходняга партнёрства і Расіі. Ён забяспечвае падтрымку ва ўдасканаленні палітыкі, стратэгій і рынкавых механізмаў у галіне змянення клімату, а таксама экспертную дапамогу і распрацоўвае стратэгіі па адаптацыі сельскай гаспадаркі.**

**Парыжскае пагадненне (падпісана 22 красавіка 2016 года) — дакумент Рамачнай канвенцыі ААН аб змяненні клімату, які рэгулюе меры па зніжэнні вуглякіслага газу ў атмасферы з 2020 года. Асноўная мэта дакумента — дамагчыся стабілізацыі канцэнтрацый парніковых газаў у атмасферы на такім узроўні, які б не дапускаў небяспечнага антрапагеннага ўздзеяння на клімат. Краіны-ўдзельніцы пагаднення вызначаюць свае ўнёскі ў дасягненне дэкларыванай агульнай мэты ў індывідуальным парадку, пераглядаюць іх раз у пяць гадоў.**

**Вольга ПРАЛЮК.**
*pralyuk@zviazda.by*

■ Далучайцеся!

# НАМ ДА ЎСЯГО ЁСЦЬ СПРАВА:

## валанцёры «Зялёнай сеткі» аб неабыякавым стылі жыцця

**Вядомая фраза: «Калі хочаш змяніць свет — пачні з сябе» шмат каго матывуе рабіць нешта карыснае. Але ёсць людзі, якія не могуць абмяжоўвацца толькі сабой, яны хочуць дзяліцца ведамі і вопытам з іншымі. Яны вераць, што нават нязначная дапамога можа быць вельмі важнай. Асабліва, калі гэта тычыцца таго месца, дзе мы жывём. Валанцёры «Зялёнай сеткі» расказалі, чаму яны вырашылі пайсці па экалагічнай сцежцы і што для іх значыць быць валанцёрам.**



**Люся НІКІЦЕНКА:**

— У свядомым узросце пачала паглыбляцца ў пытанні экалогіі: сартаванне смецця, высечка дрэў. У той час актыўна чытала «Зялёны партал». Там шмат пра новыя праблемы даведалася. І неяк усё закруцілася. Не змагла застацца ўбаку, бо я такі чалавек, якому да ўсяго ёсць справа. Хацелася (і хочацца) змяняць гэты свет да лепшага.

Звычайна я дапамагаю ўсюды, дзе маю магчымасць. Раней прымала ўдзел у «Нітках сяброўства», ва ўніверсітэце пастаянна «валанцёрыла» ў самых разнастайных праектах, хадзіла ў сабачы прытулак, дапамагала «Гарадскому ляснічаму» ў правядзенні Дня без паперы.

Што для мяне значыць быць валанцёрам? Аднойчы пачула фразу, што валанцёрства — гэта стыль жыцця. Калі ты знаходзіш сябе ў ім, то потым складана (я нават сказала б, немагчыма!) жыць па-іншаму. З часам разумееш, што іншыя людзі за такую работу грошы бяруць, а ты не можаш, бо сумленне не дае думаць пра такое, бо маеш вышэйшыя мэты, бо працуеш за ідэю і з думкаю, што робіш гэты свет крышачку лепшым.



**Яна БОНДАР:**

— Я валанцёр не больш за год. Разумею, што многім экалагічным праектам патрэбна дапамога, таму імкнуся быць усюды карыснай.

Пачынала з малога: займалася дабрачыннымі сустрэчамі на экалагічным партале. Пазней далучылася да грамадскіх арганізацый: «Ахова птушак Бацькаўшчыны», «Гарадскі ляснічы», Мінскае веласіпеднае таварыства. На гэты момант з аднадумцамі арганізавалі праект «Ёга Дабра»: праводзім заняткі па экалогіі і ёзе ў адной са школ Мінска.

Акрамя гэтага, займалася падлікам дрэў у парку Котаўка, абменам макулатуры на саджанцы. Найбольш запомнілася ўборка на тэрыторыі парка «Сярэбраны Лог» у рамках акцыі «Зробім!», куды прыйшло каля 70 чалавек. Усе хацелі зрабіць свой унёсак, каб тэрыторыя парку была чыстай і прыемнай для прагулкі. Гэта ў нас атрымалася.

Мяне радуе, што так шмат людзей цяпер неабыякавыя да таго, што нас акружае, і гатовы дзейнічаць.



**Марыя ДЗЮБЕНКА:**

— Я эколаг па прафесіі, а валанцёрства для мяне — гэта магчымасць свядома ставіцца да сваіх дзеянняў, учынкаў і падаваць прыклад іншым. Я лічу, што не ўсё ў гэтым свеце павінна рабіцца за грошы, і дапамагаць можна і трэба бясплатна.

Самая важная падзея за часы валанцёрства — гэта ўдзел у эка-майстэрнях для дзетак з абмежаванымі магчымасцямі. Гэты праект дапамог мне глянуць на многія рэчы па-іншаму.

Дзякуючы валанцёрству я знайшла аднадумцаў. Вельмі рада, што знаходжуся побач з тымі, хто падзяляе мае мэты, погляды і жаданні.

***Стаць валанцёрам «Зялёнай сеткі» вельмі проста: дастаткова зайсці на сайт і запоўніць анкету. Пасля гэтага на пошту будуць прыходзіць лісты з цікавымі «зялёнымі» прапановамі. Быць карысным не складана насамрэч.***

**Кацярына КІРЭЕВА**

# БРАТЫ МЕНШЫЯ

## НЕ ЗАГАНЯЙЦЕ ЖЫВЁЛУ Ў КУТ



Фота БЕЛТА.

**Што агульнага ў чалавека і братоў яго меншых? Ці заўсёды агрэсіўныя паводзіны жывёлы сігналізуюць аб хваробе? Якія асаблівасці паводзін насельнікаў заапаркаў і чаму нельга адпускаць іх на волю, расказала Алена БАДРОВА, малодшы навуковы супрацоўнік Мінскага заапарка.**

***— Пры якіх абставінах здаровая дзікая жывёла можа паводзіць сябе агрэсіўна ў адносінах да чалавека?***

— Дзікія жывёлы да людзей не ідуць, наадварот, яны хаваюцца. Нават мядзведзь-бадзяга, які прачнуўся раней часу, можа напасці на іншых жывёл, а вось на чалавека — у крайнім выпадку і, як правіла, у адказ на агрэсію. Любая агрэсія звера — матываваная: ён змагаецца за ежу, тэрыторыю, самку, патомства. Калі няма матывацыі — гэта праява хваробы.

Усе жывёлы — і дзікія, і свойскія — паводзяць сябе крыху дзіўна ў шлюбны перыяд. Зрэшты, і паводзіны закаханых людзей камусьці збоку могуць здацца не зусім звычайнымі.

У такі перыяд дзікія жывёлы, напрыклад самцы аленяў, актыўна абараняюць сваю тэрыторыю. Яны б'юць саперніка-самца капытамі, рагамі, гучна «трубяць», апавяшчаючы супляменнікаў пра тое, што тэрыторыя занятая. Чалавеку ў гэты час лепш не трапляць у «аленевыя» ўладанні.

Што тычыцца хатніх жывёл, то ўсе, напэўна, чулі начныя «канцэрты» катоў у сакавіку. Так самцы адпужваюць сапернікаў, паведамляюць аб сваіх намерах, увогуле, даюць волю асноўнаму інстынкту, які заклікае жывёл да размнажэння.

Але найбольшую небяспеку ўяўляюць самкі з дзіцянятамі. Напрыклад, мядзведзіца можа напасці на чалавека, калі паблізу знаходзяцца медзведзяняты. Гэта характэрна не толькі для драпежнікаў, але нават і для цалкам міралюбівых жывёл. І нават дамашняя кошка будзе шыпець і кусацца, калі чалавек паспрабуе дакрануцца да яе кацянят.

***— Ці ёсць узаемасувязь паміж агрэсіўнымі паводзінамі жывёл і рознага роду прыроднымі з'явамі? Вось, напрыклад, па Нясвіжы шпацыраваў даволі агрэсіўны дзік, яго нават давялося застрэліць, меркавалі таксама, што ён хворы на шаленства. Але як нам паведамілі супрацоўнікі Нясвіжскай раённай ветэрынарнай станцыі, згодна з вынікамі лабараторнага даследавання, дыягназ не пацвердзіўся...***

— Любая прыродная з'ява, якая выходзіць за межы звыклай сітуацыі, выклікае ў жывёлы стрэс. Найбольш востра развіта інтуіцыя і, адпаведна, рэакцыя на прыродныя катаклізмы ў дзікіх прадстаўнікоў фаўны: яны пакідаюць звыклае месца, адчуваючы небяспеку.

***— Як сябе паводзіць чалавеку, каб не выклікаць агрэсію жывёл?***

— Каб не стаць ахвярай, напрыклад, дваровых сабак ці дзікай жывёлы, нельга іх правакаваць. Не чапайце прыплод ці цяжарных самак, не чапайце ежу жывёл і не занадта шуміце ў лесе, увогуле, не турбуйце жывёл у месцах іх пражывання. Нават калі корміце бяздомную кошку і выпусцілі з рук прызначаную ёй ежу, не падымайце яе, каб даць з рук другі раз. Кошка гэты кавалак ужо лічыць сваім, і такі «замах» ёй не спадабаецца.

Самы агрэсіўны чалавек — той, якога загналі ў кут. У поўнай меры гэта адносіцца і да жывёл — ад безвыходнасці яны становяцца агрэсіўнымі. Таму заўсёды дайце зверу магчымасць адступіць. Таксама заўважу, што ў зграі бадзяжных сабак самым агрэсіўным будзе дробны, нервовы, пісклявы, а не вялікі і ўпэўнены ў сабе.

***— Алена Ільінічна, а вашы гадаванцы не баяцца людзей?***

— Хто ў якім асяроддзі вырас, той яго і лічыць сваім. Нашы гадаванцы ўпэўненыя, што яны таксама «людзі». Калі іх выпусціць у прыроду, яны не будуць баяцца людзей, пры сустрэчы з чалавекам не будуць уцякаць, хавацца. Калі ж чалавек, заспакоены такімі паводзінамі, паспрабуе ўступіць у кантакт з жывёлай, памацаць яе ці пагладзіць, прыродныя інстынкты возьмуць верх: жывёла можа напасці на чалавека і нават пагражаць яго жыццю. Заапаркаўскія жывёлы не ўмеюць ні паляваць, ні абараняцца ад іншых жывёл, і ў прыродзе яны проста загінуць.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ**

■ У свеце жывёл

# Навошта ваўку GPS?

## Новы прыродаахоўны праект Нацыянальнага парка «Белавежская пушча» дапаможа бліжэй пазнаёміцца з самым цікавым і асцярожным драпежнікам краіны



**У Беларусі здаўна называюць ваўка шэрым разбойнікам, бо гэты драпежнік — выдатны паляўнічы на буйную дзічыну — аленевых і дзікоў. Тым не менш, самі ваўкі маюць патрэбу ў абароне, упэўнены шматлікія эколагі і навукоўцы. З гэтай мэтай і з'явіўся блог «4 ваўкі», у якім змешчана шмат цікавай інфармацыі пра гэту жывёлу, а таксама тут можна сачыць за перамяшчэннем па Белавежскай пушчы ваўкоў, пазначаных адмысловымі ашыйнікамі-трэкерамі.**

**Трэкеры былі надзетыя на ваўкоў у рамках міжнароднай прыродаахоўнай праграмы ў падтрымку запаведнасці, якую рэалізуюць з 2013 года Нацыянальны парк «Белавежская пушча» сумесна з Франкфурцкім заалагічным таварыствам (Германія) і арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Праект здзяйсняецца для даследавання ваўкоў, а таксама для «рэабілітацыі» гэтага віду, паколькі да іклатых драпежнікаў у Беларусі ставяцца негатыўна.**

### ПЕРАДАТЧЫК НА ШЫІ

Спецыяльныя ашыйнікі перадаюць каардынаты прысутнасці ваўка па мабільнай сувязі. На карце, змешчанай на сайце vouk.by, любы жадаючы можа ўбачыць маршруты драпежнікаў і апісанне некаторых пунктаў іх месцазнаходжання, да якіх дабраліся даследчыкі па слядах. Уся гэта інфармацыя стала даступнай дзякуючы «разумным» ашыйнікам, якія маюць у сваёй сістэме два модулі: GPS (уключаецца па графіку і фіксуе перамяшчэнні жывёлы) і GSM (перадае інфармацыю ў выглядзе SMS-паведамлення адзін раз на тры гадзіны). Калі ж у момант перадачы воўк знаходзіцца па-за межамі пакрыцця сотавай сеткі і даслаць паведамленне не атрымліваецца, новая спроба будзе зроблена толькі праз суткі. У такім рэжыме ашыйнік можа працаваць каля года (затым ён проста спадае з шыі, дзякуючы спецыяльнай зашпільцы). Па словах кіраўніка праекта Віктара Фенчука, «маркіраваныя» ваўкі ратуюць астатніх сабратоў — у рамках праекта з 2015 года ў Белавежскай пушчы ўведзены мараторый на паляванне на ваўкоў.

Сёння пастаянныя сігналы прыходзяць толькі ад ваўчыцы, яшчэ адзін воўк адпраўляе SMS нерэгулярна. У гэтым годзе планавалася пазначыць яшчэ трох жывёл, але ўдалося злавіць толькі аднаго драпежніка — зрабіць гэта складана, бо ваўкі вельмі асцярожныя жывёлы, і чалавек іх можа ўбачыць рэдка. У наступным годзе ашыйнікі плануецца надзець на сем ваўкоў.

### ВОЎЧЫ БЛОГ

Першапачаткова праект не прадугледжваў стварэння спецыялізаванага сайта, але ў працэсе даследавання навукоўцы атрымалі столькі цікавых даных, што яны патрабавалі шырокага распаўсюджання. У выніку вырашылі стварыць сайт, да гэтай працы падключыліся валанцёры — работнікі з IT-кампаніі EPAM.

На сайце размяшчаецца папулярная інфармацыя аб даследаваннях і ваўках, якія носяць ці насілі ашыйнікі. Таксама на карце паказаны перамяшчэнні звяроў — можна ўбачыць, дзе быў воўк, чым займаўся і чым харчаваўся. Межы воўчых уладанняў, як даведаліся з гэтага праекта супрацоўнікі пушчы, значна адрозніваюцца. Самкі, напрыклад, далей за 200 км звычайна не ходзяць, у той час як тэрыторыя самцоў можа перавышаць 1000 км. Воўчыя зграі ў пушчы, па словах Віктара Фенчука, налічваюць 6—8 асобін. Менавіта такія зграі траплялі ў аб'ектывы ўстаноўленых у Нацпарку фотапастак, але некаторыя егеры сцвярджаюць, што бачылі зграі па 11—12 асобін.

### ЛЕС БЕЗ ВАЎКА — НЕСАПРАЎДНЫ ЛЕС

На працягу года ў рамках гэтага даследавання навукоўцы даведаліся, як ваўкі выкарыстоўваюць, дзеляць тэрыторыю з іншымі зграямі і як уздзейнічаюць на лес, свой арэал пражывання.

Асноўнай здабычай ваўкоў у Белавежскай пушчы з'яўляецца алень. Капытныя аказваюць вялікі ўплыў на лес, бо харчуюцца маладымі парасткамі дрэў. Такім чынам, Нацыянальны парк сёння сутыкаецца з сур'ёзнай праблемай аднаўлення масіву, значныя сродкі выдзяляюцца на падтрымку маладых дрэў. Вялікая папуляцыя аленя значна ўплывае на разнастайнасць лесу. Капытным прыходзяцца да смаку маладыя дубы і клёны, якія пасля пашкоджання часта гінуць. Такім чынам, дубоў і клёнаў становіцца ўсё менш, а грабаў, устойлівых да пашкоджанняў, больш.

Для аховы маладых дрэў ад капытных прымяняюцца розныя метады (агароджы, рэпеленты), але абаронцам лесу можа выступіць і воўк, адзначае Віктар Фянчук. Гэта было дакладна вызначана з дапамогай эксперымента з выкарыстаннем фотапастак. Каля некаторых пастак, дзе пасвіліся алені, быў раскладзены воўчы памёт — гэта імітавала блізкае месцазнаходжанне звяроў. Пах драпежніка прымушаў аленяў адчуваць сябе насцярожана — яны падымалі галовы. Знаходзячыся ў такім становішчы, алені аб'ядалі толькі верхнія часткі дрэўцаў, моцна іх не шкодзілі. Акрамя таго, капытныя адчуваюць насцярожанасць у месцах, дзе ёсць шмат паваленых дрэў і бураломy, паколькі ў такіх умовах жывёлам складана своечасова ўцячы ад драпежніка. Інтэнсіўнасць пашкоджання маладога лесу ў такіх месцах значна (на 20%) зніжаецца. Пры гэтым ваўкі не зніжаюць колькасць аленяў у лесе, яны проста запавольваюць прырост папуляцыі.

Віктар Фянчук адзначыў: прыйшоў час зразумець, што воўк — не шкодны драпежнік і не канкурэнт у паляванні на аленя, а важны элемент экасістэмы.

**Вольга ПРАЛЮК.** *pralyuk@zviazda.by*

**Фота з архіва ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны»**

# Усё, што вы хацелі ведаць пра...

## жывёл, якія зімуюць побач з намі

**У мінулым нумары спецвыпуску чытачы пазнаёміліся з галоўным крылатым героем 2017 года — чубатым жаўруком. Гэта рэдкая птушка не адлятае ў вырай, а застаецца зімаваць на радзіме. Пра тое, як зімуецца беларускім жывёлам дома, расказалі спецыялісты Нацыянальнага навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па біярэсурсах.**

### Гнёзды ў настылым лесе

Многія прадстаўнікі птушыных не вытрымліваюць беларускіх халадоў і восенню збіраюцца ў вырай. Па словах **кандыдата біялагічных навук, старшага навуковага супрацоўніка лабараторыі арніталогіі Ірыны САМУСЕНКІ**, галоўнымі месцамі выраю птушак, што гняздуюцца ў Беларусі, з'яўляюцца Заходняя Еўропа (большасць вадаплаўных птушак, чаек, некаторыя віды кулікоў і інш.) ці Афрыка (качка-чырка, многія вераб'іныя, зязюля, белы бусел і інш.).



Фота Валерыя КАВАЛЁНКА.

Хто ж застаецца зімаваць разам з намі? Перш за ўсё гэта шматлікія віды птушак, цесна звязаных з чалавекам, — шызы голуб, палявы і дамавы вераб'і. Да аселых і качэўнікаў адносіцца таксама большасць дзятлаў, сініц, попаўзняў, паўзункоў, зелянушак, шчыглоў, чыжоў. Сініцы, зелянушкі і іншыя дробныя вераб'іныя пры адносна высокіх зімовых тэмпературах могуць самі здабываць сабе ежу, чакаючы сканчэння халадоў у сховішчах у кронах дрэў, хмызняках, дуплах, натуральных нішах і нават у чалавечых пабудовах. Збіраюцца яны таксама і ў месцах падкормкі.

З драпежнікаў зімой у Беларусі можна сустрэць мясцовага арлана-белахваста, маханогага канюка (сустракаецца ў нас толькі на час міграцый). А вось арлы, каршуны, сокалы, мышаловы восенню адкачоўваюць на поўдзень. Застаюцца тут некаторыя віды нашых соў, у тым ліку вушастая сава, шэрая кугакаўка, а таксама госці з поўначы — белая і ястрабіная совы. Увогуле, многія прадстаўнікі паўночных відаў залятаюць да нас на зімоўку. Гэта амялушкі, чачоткі і крыжадзюбы, радзей сустракаюцца пеначкі, рагатыя жаўрукі, лапландскія падарожнікі. Для іх беларускія ўмовы больш лагодныя, чым на радзіме.

Але змяненне клімату затрымлівае і некаторыя мясцовыя віды птушак. Так, усё часцей зімой у Беларусі сустракаюцца чайкі — яны жывуць побач з буйнымі гарадамі на палігонах ЦБА. На сметніках і паблізу чалавечага жылля праводзяць зімы шэрыя вароны і іх сародзічы.

Сёння арнітолагі назіраюць на незамярзаючых вадаёмах краіны каля 30 відаў водна-балотных птушак, найбольш шматлікія сярод іх — качка-крыжанка, вялікі крахаль, звычайны гогаль, лебедзь-шыпун. Вадаплаўныя птушкі могуць самі здабываць сабе харчаванне, нягледзячы на тое, што раслінная ежы зімой значна менш, чым летам. А вось штучная падкормка часта прыносіць ім больш шкоды, чым карысці: яна не толькі садзейнічае збору птушак на гарадскіх вадаёмах, але і часта прыводзіць да іх гібелі з-за прабмлем са страваваннем.

Моцныя пахаладанні прымушаюць некаторыя віды беларускіх птушак адкачоўваць у заходнім напрамку, дзе кліматычныя ўмовы ў гэты час больш мяккія. А вось крыжадзюбы не баяцца халадоў — яны могуць выводзіць птушанят нават у моцныя маразы. А дабрабыт іх у гэты час падтрымліваюць добрыя ўраджаі насення хваёвых дрэў.

### Смачна паесці... і спаць!

Зіма — сур'ёзнае выпрабаванне для ўсіх жывёл, упэўнены **кандыдат біялагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі тэрыялогіі Рыгор ЯНУТА.** Невялікая колькасць і відавая разнастайнасць харчоў, моцныя халады, высокая актыўнасць драпежнікаў — усё гэта можа стаць прычынай гібелі многіх відаў млекакормячых. Але, на шчасце, большасць іх навучылася прыстасоўвацца да суровых умоў.

Назапасіць у арганізме як мага больш тлушчаў — вось адна з галоўных умоў паспяховай зімоўкі для млекакормячых. У некаторых прадстаўнікоў гэтага класа ўтрыманне тлушчу можа дасягаць да 20—25% ад масы цела.

Для ўсіх пазваночных характэрна таксама і назапашванне кармоў. Напрыклад, буразубкі здольныя ў сваіх норах збіраць вялікую колькасць чарвякоў і лічынак насякомых. Падобнымі «жывымі кансервамі», толькі з амфібій, харчуюцца зімой і прадстаўнікі куніцавых — выдра і амерыканская норка.

Многія жывёлы пры новых умовах надвор'я змяняюць і рацыён харчавання. Так, зайцападобныя, а таксама бабры пры надыходзе халадоў пераходзяць да травяністай расліннасці да драўнінна-хмызняковай.

Змена летняй вопраткі на цёплыя «пухавікі» — яшчэ адно прыстасаванне жывёл да сцюдзёнай пары. Каб маразы не змаглі пашкодзіць арганізму, некаторыя прадстаўнікі беларускай фаўны павялічваюць гушчыню валасянога покрыва ў два, а то і тры разы адносна летняга футра.



Фота Віктара КАЗЛОЎСКАГА.

Калі наступае неспрыяльны перыяд, многія жывёлы, што падрыхтаваліся да зімы, паступова змяншаюць сваю актыўнасць, а часам і тэмпературу цела — паступова яны ўпадаюць у здранцвенне ці спячку, якая мае, як аказалася, некалькі рэжымаў.

Так, простая спячка, ці «зімні сон», характэрна для бурага мядзведзя і барсука. Нягледзячы на зніжэнне тэмпературы цела, жывёлы застаюцца адчувальнымі да знешніх раздражняльнікаў і пры надыходзе спрыяльнага перыяду могуць дастаткова хутка прачнуцца.

У сапраўдны беспарапынны сон, з адсутнасцю рэакцыі на знешнія раздражняльнікі і моцным зніжэннем тэмпературы цела, упадаюць суслікі, а таксама некаторыя віды насякомаедных.

Мядзведзь для пабудовы бярлогі выбірае лясны гушчар, дзе яго не могуць патрывожыць людзі і іншыя жывёлы, робіць сваё зімняе жыллё з нагрувашчвання галін. Барсукі не любяць праводзіць зіму ў адзіноце. Яны кладуцца спаць цэлымі сямейнымі групамі, часта па 8—10 асобін. Для гэтага на схілах буйных узгоркаў жывёлы будуюць так званыя «барсучыя гарадкі», здольныя праіснаваць да 100 і больш гадоў.

Янотападобны сабака нават самыя моцныя халады здольны пераждаць у неабароненых сховішчах — напрыклад, залегчы спаць пад невялікай елкай ці заняць лісіныя норы. Спяць гэтыя жывёлкі звычайна па парах.

А вось знакаміты будаўнік, рачны бабёр, у спячку не ўпадае, таму яшчэ з восені пачынае назапашваць драўнінна-хмызняковую расліннасць, будаваць і абнаўляць плаціны. Дзякуючы запасам ежы грызун можа не выходзіць на паверхню доўгі час. Зімуюць бабры таксама цэлымі сямейнымі групамі па 6—10 асобін.

Беларускія волаты — зубры — з надыходам першых замаразкаў збіраюцца ў вялікія статкі і перабіраюцца бліжэй да падкормачных пляцовак. Казулі і іншыя капытныя аб'ядноўваюцца ў невялікія групы па 3—5 асобін паміж буйнымі ляснымі комплексамі.

Разам з іншымі млекакормячымі рыхтуюцца да зімы і драпежнікі. Ваўкі зімуюць зграямі па 6—8 асобін, лісіцы ўслед за «ежай» — мышападобнымі грызунамі — перабіраюцца на ўзлескі.

### Гэта цікава

- Часам дзік праводзіць зіму ўсяго за 200—300 метраў ад месца актыўнасці ваўка.
- Прадстаўнікі куніцавых здольныя ўтрымліваць развіццё плоду і ўзнаўляць яго з надыходам вясны.
- Некаторыя прадстаўнікі млекакормячых у прамым сэнсе збягаюць ад халадоў. Напрыклад, паўночны алень можа перадольваць адлегласць у 1000 км і больш. У нашай краіне мігрыруюць некаторыя віды кажаноў.
- Анамальныя выпадкі зімоўкі земнаводных і гадаў часцей за ўсё назіраюцца ў месцах актыўнасці гаспадарчай дзейнасці чалавека. Так, трытонаў, жаб і іншых земнаводных можна сустрэць на будаўнічых пляцоўках, цокальных паверхах непраграваных будынкаў, у тунэлях і калодзежах цеплатрас. Прыходзяцца даспадобы жывёлам і кучы камення на ўскрайках лясоў, прыбраныя з суседніх палёў.

### Заміраюць разам з прыродай

У прадстаўнікоў герпетафаўны (земнаводных і паўзуноў) няма спецыяльных механізмаў, якія падтрымліваюць тэмпературу цела на пэўным узроўні. Іх стан вельмі моцна залежыць ад тэмпературы наваколля. І з надыходам моцных халадоў гэтыя жывёлы могуць проста замерзнуць. Таму сваю наземную актыўнасць паўзуны і земнаводныя спыняюць ужо ў канцы верасня — пачатку кастрычніка, расказаў **кандыдат біялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі наземных бесхрыбетных жывёл Сяргей ДРАБЯНКОЎ.**

Сярод жывёл, якія выбіраюць сваім зімнім сховішчам глебу, — шэрыя, зялёная і чаротавая рапухі, часночніца звычайная, квакша звычайная, травяная і вастрамордая жабы, звычайны і грабеньчаты трытоны, а таксама тры віды яшчарак (порстка, жывародная і вераценніца), і тры віды змей (гадзюка, вуж і мядзянка).

Чакаюць надыходу вясны яны на асушаных тарфяніках, нізінных і верхавых балотах на глыбіні 20—30 см ад паверхні, а ў моцныя маразы апускаюцца ніжэй. Любяць яны і ўзлескі, што часта праграваюцца сонцам. Жабы зімуюць на ўчастках з пясчанай глебай — яны лёгка закопваюцца ў рыхлы пясок ці шукаюць паветраныя поласці ў зямлі і норы мышападобных грызуноў. У гэту пару яны практычна не дыхаюць.

Каб вытрымаць працяглыя халады, прадстаўнікі герпетафаўны праводзяць калектыўныя зімоўкі. Самыя масавыя з іх — да некалькіх сотняў асобін — назіраюцца ў змей.

Маладыя гады часта зімуюць побач з дарослымі, больш вопытнымі жывёламі, у месцах, правераных папярэднімі пакаленнямі. Збіраючыся ў падземных сховішчах групамі, змеі за кошт цеснага кантакту аднаго з адным атрымліваюць дадатковае цяпло, чым, хоць і нязначна, але павышаюць шанц на выжыванне падчас доўгай зімы.



Добра адчуваюць сябе ў халадах і тыя прадстаўнікі герпетафаўны, што выбралі ў якасці зімняга сховішча ваду. Гэта чырванабрухая жарлянка, сажалкавая, азёрная і ядомая (гібрыдная) жабы, а таксама балотная чарапаха.

Зімуюць яны ў тых жа вадаёмах, дзе праводзяць і лета. Жабы і іншыя земнаводныя апускаюцца на дно, дзе закопваюцца ў глей, ці перабіраюцца ў сырыя месцы з вільготнай порыстай глебай. У вадаёмах перасяляецца і тыпова наземны від земнаводных — травяная жаба. Вялікая колькасць гэтых амфібій нагадвае шары, у якіх налічваецца ад некалькіх дзесяткаў да тысячы асобін. Пад ільдом зімуе і балотная чарапаха.

Цікава, што на зімоўках жабы могуць мірна суіснаваць з вужамі, якія звычайна імі харчуюцца. Справа ў тым, што з-за нізкай тэмпературы навакольнага асяроддзя змеі не палююць. У момант суровых выпрабаванняў жывёлы аб'ядноўваюцца для больш важнай мэты — выжыць.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

*kolasava@zviazda.by*

# НЕПРЫРУЧАНЫ ДЗІКІ НІКАР

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

На сёння ў краіне адноўлена больш за 50 тыс. га тарфянікаў, да 2030 года планецца аднавіць яшчэ 75 тыс. га. Вопыт Беларусі вялікі і эфектыўны, методыка працы параўнальна танная (усяго 11,2 долара ЗША на 1 га адноўленага балота!), таму нашыя распрацоўкі ўжо пераймаюць іншыя краіны. **Намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь Ігар КАЧАНОЎСКІ** адзначыў, што ўлады не збіраюцца спыніцца на дасягнутым, з дапамогай грамадскіх арганізацый, мясцовых органаў улады і насельніцтва можна ажыццявіць аднаўленне балотных экасістэм. **Міхаіл БРАМБАХЕР, каардынатар Еўрапейскіх праграм Франкфурцкага заалагічнага таварыства,** нагадаў пра статус Белавежскай пушчы як аб'екта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, падкрэсліў, што беларускі Нацыянальны парк мае такое ж сусветнае значэнне, як Серэнгеці ў Танзаніі ці Елаўстон у ЗША. Прадстаўнік нямецкага таварыства з горыччу сказаў, што для Германіі забалоціць тысячу гектараў зямлі сёння немагчыма, мерапрыемствы ў такіх маштабах там не праводзяцца.

### ПАЧАТАК ДРУГОГА ЖЫЦЦЯ

Пасля заканчэння прэс-канферэнцыі прысутныя выехалі на месца запланаванага старту работ. Удзельнікі ўрачыста перарэзалі чырвоную стужку і зрабілі сімвалічны падкоп на месцы забалочвання. Пасля гэтага пачала працаваць тэхніка:

— Мы аднаўляем аазіс жыцця для ўсёй Белавежскай пушчы, — сказаў **Мікалай ЧЭРКАС, спецыяліст ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» па прыродаахоўных пытаннях.** — Праз год будзе прыкметны першы невялікі вынік, праз дзясятак гадоў сюды вернуцца птушкі. Каб балота аднавілася цалкам, трэба чакаць не менш за 30—35 гадоў...

Пасля завяршэння мерапрыемства прысутныя выказалі жаданне сустрэцца на Дзікім Нікары праз 10 гадоў, каб на свае вочы ўбачыць змены да лепшага.

**Вольга ПРАЛЮК.**

*pralyuk@zviazda.by*



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Экадзіва

# Белыя львы — абярэг ад няшчасцяў і роспачы

**Два гады таму ў Мінскім заапарку пасяліліся белыя тыгры, а сёлета ў лістападзе тут з'явіліся двое белых ільвянят. Супрацоўнікі заапарка кажуць, што да гэтых жывёл назіраецца павышаная цікавасць наведвальнікаў.**

Другое месца па аб'ёме здабычы займае Расія. Найбуйнейшай расійскай кампаніяй, якая здабывае плаціноіды (у гэтую групу акрамя плаціны ўваходзяць паладый і радый), з'яўляецца «Нарыльскі нікель». Трэці радок у рэйтынгу краін, найбольш багатых плацінавымі радовішчамі, займае Зімбабвэ. Там размешчана другое па запасах плаціноідаў радовішча — Дарвендэйл, якое, зрэшты, пакуль знаходзіцца толькі на пачатковай стадыі асваення. На фоне падзення цэн у 2013 — 2015 гадах сусветныя вытворцы пачалі пошукі радовішчаў, больш танных з пункту гледжання сабекошту вытворчасці. Самы нізкі сабекошт здабычы плаціны цяпер у Зімбабвэ. Гэтым і спрабуюць скарыстацца ў расійскіх «Растэху» і Vi Holding. Абедзве кампаніі ўваходзяць у кансорцыум, які займаецца распрацоўкай радовішча Дарвендэйл у Зімбабвэ. Па словах Ігара Хігера, гендырэктара расійска-зімбабвійскага сумеснага прадпрыемства Great Dyke Investments, асноўнай перавагай праекта якраз з'яўляецца нізкі сабекошт здабычы.

У 2014 годзе ў свеце была здабыта 161 тона плаціны. Лідарамі здабычы сталі: ПАР — 110 тон, Расія — 25, Зімбабвэ — 11, Канада — 7,2, ЗША — 3,7 тоны. Агульны аб'ём вытворчасці плаціны ў 2015 годзе ў свеце склаў 7,83 млн унцый, павялічыўшыся на 7,6% у параўнанні з 2014-м.

Пяты год запар на сусветным рынку плаціны назіральнікі фіксуюць значны дэфіцыт гэтага металу. Калі ў 2012 годзе ён складаў усяго каля 6 тон, то па выніках мінулага года павялічыўся ўжо да 20,6 тоны. А да канца гэтага года, па прагнозах экспертаў Johnson Matthey, попыт на плаціну ва ўсім свеце перавысіць прапанову амаль на 27 тон. Усё гэта проста не магло не адбіцца на біржавых каціроўках гэтага высакароднага металу.

Ці не галоўная прычына дэфіцыту плаціны і, як следства, росту цэн на яе — абвальнае падзенне здабычы і вытворчасці ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы. Яшчэ ў 2011 годзе ПАР выпрабляла звыш 150 тон плаціны ў год, аднак за некалькі гадоў гэты паказчык зваліўся да 110 тон. Гэта адбылося як з-за шматлікіх забастовак на плацінавых рудніках, так і праз значнае скарачэнне інвестыцый у асваенне тых, што ўжо распрацоўваюцца, і перспектыўных участкаў радовішчаў плаціноідаў. Так, па звестках Venmyn Deloitte, з 2008-га па 2015 год аб'ём капітальных укладанняў у ПАР у здабычу знізіўся амаль утрая — з 30 млрд да 11 млрд рандаў у год (0,7 млрд долараў). А па выніках гэтага года інвестыцыі скароцяцца яшчэ на 1—2 млрд рандаў. «Усё гэта непазбежна прывядзе да таго, што здабыча плаціны ў паўднёваафрыканскіх вытворцаў у бліжэйшыя два гады ўпадзе як мінімум на 16 працэнтаў», — прагназуюць аналітыкі Venmyn Deloitte. Такім чынам, відавочна, што на рынку фарміруецца доўгатэрміновы трэнд росту цэн.

### Перспектыўны варыянт

У адрозненне ад золата плаціна ў большай ступені гандлюецца не як аб'ект для інвестыцый, а як метал, што выкарыстоўваецца ў прамысловасці. З развіццём радыётэхнікі, медыцынскай апаратуры, аўтамабільнай прамысловасці, камп'ютарнай і касмічнай індустрыі патрабаваліся дэталі са зносастойкіх металаў, якія не падвяргаліся б карозіі і не ўступалі ва ўзаемадзеянне з прылеглымі матэрыяламі. Такімі ўласцівасцямі валодала плаціна, таму попыт на яе стаў расці. Разам з попытам узляцелі і цэны на гэты рэдкі метал. Да канца XX — пачатку XXI стагоддзя плаціна стала самым дарагім з высакародных металаў, яе кошт перавысіў амаль удвая кошт золата. Яшчэ ў сярэдзіне 2008 года «маленькае срэбра» каштавала больш чым на $1000 за унцыю вышэй за «жоўтага д'ябла». Аднак падчас сусветнага эканамічнага крызісу попыт на аўтамабілі ўпаў, а паколькі больш за палову гадавой здабычы плаціны выкарыстоўваецца менавіта ў аўтамабілебудаванні, то і кошт гэтага металу рэзка знізіўся. Сітуацыя пачала мяняцца ў канцы таго ж 2008-га, калі «цэннік» на плаціну абрынуўся з $2000 да менш чым $900 за унцыю, на некалькі дзён зваліўшыся ніжэй каціровак золата. Аднак ужо праз год, у сувязі з паляпшэннем эканамічнага дабрабыту грамадства, патрэба ў вытворчасці новых аўтамабіляў павялічылася, і цана вырасла. Да канца 2010 года унцыя плаціны каштавала ў тры разы больш, чым унцыя золата. Гэты скачок быў звязаны з аднаўленнем і адноснай стабілізацыяй сусветнай эканомікі. А ў 2011 годзе з-за крызісу ў ЗША на сусветным рынку стала зноў лідзіраваць золата, якое і цяпер наперадзе. Прынамсі пакуль.

У адрозненне ад многіх іншых сыравінных тавараў рынак плаціны не пакутуе ад прафіцыту. Летась, паводле звестак World Platinum Investment Council, дэфіцыт плаціны на сусветным рынку склаў 380 тыс. унцый. Гэта таксама ацэньваецца інвестарамі як спрыяльны фактар для ўкладанняў у гэты метал. Зрэшты, цяперашні рост цэн на плаціну наўрад ці будзе доўжыцца на працягу ўсяго года. Згодна са справаздачай Сусветнага банка, па выніках 2016-га кошт металу будзе вагацца каля $950 за унцыю, што ўсё ж будзе вышэй, чым адпаведныя ф'ючарсы ў пачатку года. У далейшым рост цэн на плаціну працягнецца, але не такімі імклівымі тэмпамі: у 2017 годзе, паводле прагнозу Сусветнага банка, кошт ушчыльную наблізіцца да адзнакі $1000 за унцыю, і банк чакае, што толькі ў 2025 годзе метал вырасце ў цане да $1500 за унцыю.

«Плаціна знаходзілася працяглы час ніжэй каціровак золата толькі чатыры разы за апошнія сорак гадоў. Ва ўсіх выпадках яна вяртала сабе лідарства ўжо на наступны год», — адзначае Том Вінміл з фонду Midas. З ім пагаджаецца Раян Макінтаер, аналітык з Tocqueville Asset Management: «Досыць рэдка адбываецца зніжэнне каціровак плаціны ніжэй за ўзровень золата».

**Плаціна ўжывалася пры вырабе знакаў адрознення за выдатныя заслугі: з гэтага металу зроблена выява Уладзіміра Ільіча на савецкім ордэне Леніна, з яе выраблялія ордэн «Перамога», ордэн Суворава першай ступені і ордэн Ушакова першай ступені.**

Але і ў гэтым пытанні адзінства думак сярод спецыялістаў няма. Па словах Майка Андэрхіла, партфельнага кіраўніка ў фондзе RidgeWorth, калі і ўкладваца ў ф'ючарсы на плаціну, то варта гэта рабіць толькі на кароткіх пазіцыях: «Пакуль сусветны эканамічны рост застаецца млявым, будучыня плаціны пад пытаннем». Кіраўнік фірмы Penn Mutual Asset Management Жыўэй Рэн і ўвогуле мяркуе, што попыт на метал спекулятыўны і ў найбліжэйшай перспектыве рост цэн спыніцца. Тым не менш многія аналітыкі лічаць, што стаўка на плаціну — перспектыўны варыянт, паколькі гэта дасюль найбольш запатрабаваны каштоўны метал з «вялікай тройкі» (куды яшчэ ўваходзяць золата і срэбра).

**Захар БУРАК.**
*burak@zviazda.by*



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.
**Продавец:** ОАО «Витебскхлебпром», 210024, г. Витебск, ул. Горбачевского, 5, тел. (0212) 35-86-82.

Лот №1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-108266 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Змитрока Бядули 3-я, 27, пом. 39, площадью 174,7 кв.м, наименование: торговое помещение. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 35 200/352 000 000 без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 3 520/35 200 000 руб.

Лот №2. Изолированное помещение с инв. № 200/D-108263 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, 22/2-87, площадью 297,4 кв.м, назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение с рампой. Нач. цена (с учетом/до деноминации): 190 250/1 902 500 000 бел. руб. без НДС. Задаток (с учетом/до деноминации): 09 025 / 190 250 000 руб.

Повторный аукцион состоится 16.01.2017 г. в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 13.12.2016 г. с 8.30 по 13.01.2017 г. до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 05.11.2016, 14.10.2016.

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 N 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ — копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ — нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр.лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя — доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица — документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г. Витебск, ул. Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

## ИЗВЕЩЕНИЕ

### Мотыкальский сельский исполнительный комитет Брестского района (организатор аукциона) извещает о проведении 17 января 2017 года открытого аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| № лота | Местоположение земельного участка и кадастровый номер земельного участка | Характеристика участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на изготовление земельно-кадастровой документации и регистрацию земельного участка (руб.) | Целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская обл, Брестский р-н, д. Тюхиничи, ул. Набережная, 26 № 121283008601000510 | **Земельный участок площадью 0,1481 га. Земельный участок на всей площади имеет ограничения в использовании земель. Вид ограничений: земельный участок расположен в водоохранной зоне реки Лесная** | 0,1481 | 18000 | 1800 | 1280,34 рубля + (возмещение расходов на объявления в СМИ о проведении аукциона согласно акту выполненных работ) | строительство и обслуживание жилого дома |

**Аукцион будет проводиться 17.01.2016 г. в 10.00 по адресу: Брестский р-н, аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6 (здание сельисполкома)**

Для участия в аукционе гражданин со дня опубликования настоящего извещения и **до 17:00 11 января 2017 г. представляет в комиссию по организации и проведению аукциона по адресу: аг. Б. Мотыкалы, ул. Центральная, 6, документы:**
заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка;
копию платежного поручения о внесении задатка в размере 10% от начальной цены предмета аукциона (1800,00 белорусских рублей 00 копеек на расчетный счет Мотыкальского сельисполкома, № 3641000000275 в филиал №100 ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Брест, код 246, с назначением платежа «Задаток за земельный участок», с отметкой банка о его исполнении;
При подачи документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь.
К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанный в извещении срок соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в настоящем извещении.
Осмотр земельного участка осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.
Контактные телефоны**: (8-0162) 949-135, (8-029) 761-92-84.**
Аукцион проводится при наличии не менее двух участников. Аукцион проводится в порядке, определенном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. №462.
Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему земельного участка в частную собственность с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на пять процентов, обязан:
- подписать протокол в день проведения аукциона;
- в течение 10 рабочих дней со дня принятия утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона, внести плату за земельный участок на счет ГУ МФ РБ по Брестской области бюджет Мотыкальского сельисполкома, № 3600213060057 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Минск, код 795, назначение платежа 04901, УНП 200676206;
- возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для его проведения, на расчетный счет ГУ МФ РБ по Брестской области бюджет Мотыкальского сельисполкома, № 36002130600057 в ОАО «АСБ «Беларусбанк» г. Брест, код 795, назначение платежа 04616, УНН 200676206;
- приступить к занятию земельного участка в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство жилого дома, но не позднее одного года с момента государственной регистрации права частной собственности на земельный участок, также возместить затраты на строительство, проектирование, объектов распределительной инженерной и Транспортной инфраструктуры к данному земельному участку согласно постановлению Совета Министров РБ от 01.04.2014 г. № 298

Минский городской центр недвижимости

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 26 декабря 2016 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена без НДС | Размер задатка |
| 1. | «Автозаправка с площадкой» общей площадью 5221,5 кв. м, инв. номер 630/С-67164, расположенная по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143Н (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) с составными частями и принадлежностями | 159 200,00 бел. руб. (1 592 000 000 бел. руб. образца 2000 года) | 15 900,00 бел. руб. (159 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| 2. | «Склад готовой продукции» общей площадью 807,1 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-73745, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143/6 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 62 720,00 бел. руб. (627 200 000 бел. руб. образца 2000 года) | 6 200,00 бел. руб. (62 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |

**Продавец имущества:** ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.
**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.
**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предметов торгов в соответствии с протоколом о результатах торгов.
Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:
заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.
Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.
Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.
В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.
Торги проводятся 26 декабря 2016 года в 16.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 14.12.2016 по 22.12.2016 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.
Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(0176)74-72-04 (ОАО «Электромодуль»).

БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

## ОАО «БНБ-БАНК»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2016 года

Наименование банка: ОАО «БНБ-БАНК»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | 2016 | 2015 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **1** | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 21 003 | 19 244 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 9 901 | 88 677 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 28 156 | 24 460 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 57 060 | - |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 260 999 | 229 185 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Инвестиции в зависимые юридические лица | | | - | - |
| 10 | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | | - | - |
| 11 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 12 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 15 748 | 14 039 |
| 13 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | 1 118 | 1 612 |
| 14 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | 29 |
| 15 | Деловая репутация | | | - | - |
| 16 | Прочие активы | 1112 | | 9 958 | 7 547 |
| 17 | ИТОГО активы | 11 | | 403 943 | 384 793 |
| **18** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 19 | Средства Национального банка | 1201 | | - | 10 430 |
| 20 | Средства банков | 1202 | | 89 360 | 69 842 |
| 21 | Средства клиентов | 1203 | | 243 417 | 221 400 |
| 22 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | 12 831 | - |
| 23 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | 29 054 |
| 24 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 25 | Прочие обязательства | 1207 | | 5 390 | 5 925 |
| 26 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 350 998 | 336 651 |
| **27** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 28 | Уставный фонд | 1211 | | 11 075 | 11 073 |
| 29 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 30 | Резервный фонд | 1213 | | 6 400 | 6 369 |
| 31 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 9 350 | 8 749 |
| 32 | Накопленная прибыль | 1215 | | 26 120 | 21 951 |
| 33 | Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации-банку | | | 52 945 | 48 142 |
| 34 | Доля неконтролирующих акционеров | | | - | - |
| 35 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 52 945 | 48 142 |
| 36 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 403 943 | 384 793 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках за 3 квартал 2016 года

Наименование банка: ОАО «БНБ-БАНК»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт приме-чаний | 2016 год | 2015 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 31 762 | 27 757 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 15 039 | 14 914 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 16 723 | 12 843 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 6 576 | 6 198 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 1 846 | 1 283 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 4 730 | 4 915 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (1) | - |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 7 516 | 20 422 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | (3 375) | (12 167) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 8 791 | 6 512 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 2 653 | 1 750 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 12 986 | 9 439 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 846 | 930 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 5 623 | 10 882 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 1 322 | 2 793 |
| 17 | Прибыль (убыток) | 2 | | 4 301 | 8 089 |
| 18 | Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц | | | - | - |
| 19 | Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц | | | - | - |
| 20 | Итого прибыль (убыток) | | | 4 301 | 8 089 |
| 21 | Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации | | | 4 301 | 8 089 |
| 22 | Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке) | | | - | - |
| 23 | Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях | | | | |
| 24 | Базовая прибыль на простую акцию | | | - | - |
| 25 | Разводненная прибыль на простую акцию | | | - | - |

Заместитель Генерального директора С.К. Сабук

Главный бухгалтер Н.П. Шнип

Дата подписания «28» ноября 2016 года

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка:
**http://www.bnb.by/o-banke/finansovye-pokazateli/finansovaya-otchetnostj/otchet-o-pribyli-i-ubytkakh.html**

**Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»**
Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь № 10 от 07 июня 2013 г.
УНП 100513485.

**Ганна ГАРЧАНОК:**

# «УСЁ РАДЗЕЙ УСПАМІНАЮ РЫА, БОЛЬШ ДУМАЮ ПРА ТОКІА»

## Дэбютантка Алімпійскіх гульняў пра жыццё на вышыні трохпавярховага будынка

**Нашы батутысты — гэта спартсмены, у якіх не пытаюцца, дзе знаходзіцца Беларусь, таму што сваімі дасягненнямі яны з году ў год прымушаюць сапернікаў выразна ўяўляць наша месцазнаходжанне на карце. Пасля перамогі Улада Ганчарова ў Рыа гэта стала яшчэ больш відавочным, а на малой радзіме наваспечанага алімпійскага чэмпіёна — у Віцебску — пачаўся сапраўдны бум батутнага спорту. Адтуль, дарэчы, і многія іншыя нашы знакамітыя батутысты, у тым ліку нявеста Уладзіслава — Ганна Гарчанок. Яна ўжо стала віцэ-чэмпіёнкай свету і чэмпіёнкай Еўропы, на Алімпіядзе ў Бразіліі таксама годна змагалася за ўзнагароды, але дапусціла памылку і стала толькі восьмай.**

У інтэрв'ю карэспандэнту «Звязды» Ганна расказвае пра тое, як перажывала няўдачу ў Рыа-дэ-Жанэйра, хто прадказвае ёй медалі і як гэта — быць каханай алімпійскага чэмпіёна.

***— Аня, пасля Алімпіяды прайшло ўжо больш за тры месяцы, часта ўспамінаеш тыя імгненні?***

— Першыя часы, хочаш не хочаш, гэта кружылася ў галаве. Калі спаборніцтвы атрымліваюцца правальныя, нешта пастаянна сядзіць у падсвядомасці і грызе. Думаеш пра тое, як гэта было і як бы магло быць. Я не самаед, але стараюся ўсё прааналізаваць і зрабіць высновы, каб у далейшым пазбегнуць памылак. Цяпер, відома, усё радзей успамінаю Рыа, ужо больш думаю пра Токіа.

***— Усё ж такі выступленне ў Бразіліі лічыш правальным?***

— Любыя спаборніцтвы ўспрымаю як працу, мне неабходна зрабіць тое, што запланавана, не заняць пэўнае месца, а выканаць практыкаванне так, каб я сышла з батута і засталася сабой задаволеная. Улад кажа, што васьмёрка найлепшых — гэта не правал, але я засталася незадаволена сабой.

***— У чым заключалася галоўная памылка на алімпійскім батуце?***

— Калі шчыра, да гэтага часу не магу зразумець. Літаральна за пару дзён да ад'езду на Алімпіяду ў мяне здарылася нешта падобнае на зрыў. Я заходзіла на батут і проста баялася скакаць, як быццам першы раз апынулася там. Такое перыядычна здараецца ў нашым відзе спорту. Калі мне было 16, я практычна год наогул не скакала, трэнеры ўжо паставілі крыж на мне. Але ўсё ж звычайна гэта здараецца ў тыя моманты, калі яшчэ шмат часу да спаборніцтваў, за яго ты можаш пераадолець сябе, а тут галоўны старт...

Мы прыехалі ў Рыа, там першы час мне даводзілася нават ставіць трэнера на батут для падстрахоўкі, усе глядзелі на гэта велізарнымі вачыма, маўляў, як яна збіраецца скакаць алімпійскую праграму? Праз пару дзён я ўсё ж такі неяк пераадолела страх і прымусіла сябе працаваць, аднак непрыемны асадак заставаўся. Замест таго, каб дапрацаваць нейкія нюансы ў праграме, я змагалася сама з сабой, з нейкімі неіснуючымі праблемамі.



Ганна і Улад адразу пасля перамогі Ганчарова ў Бразіліі.



На Еўрапейскіх гульнях у Баку Ганна стала бронзавым прызёрам.

**Біяграфічная даведка**

Ганна Гарчанок нарадзілася 11 лютага 1992 года ў Віцебску. Бронзавы прызёр чэмпіянату свету 2014 года ў індывідуальных скачках. Чэмпіёнка Еўропы-2014 у індывідуальных скачках. Сярэбраны прызёр сёлетняга чэмпіянату Еўропы.



***— Перамога Улада паменшыла сум ад тваёй няўдачы?***

— Вядома, хоць хтосьці зрабіў усё, што мог. Ён малайчына, мы за яго хварэлі. Я, калі выступаю сама, хвалююся не так, як за іншага, пры тым, што гэта не проста таварыш па камандзе, а каханы чалавек. У сваёй праграме ўсё ў тваіх руках, а Уладу я нічым дапамагчы не магла. Была на трыбуне, але ўседзець на месцы гэтыя 20 секунд не змагла.

***— Якімі былі яго першыя словы пасля перамогі?***

— Прайшло ўзнагароджанне, потым інтэрв'ю журналістам і толькі потым я змагла ўбачыць Улада. Яго вочы ззялі шчасцем і ён сказаў: «Я так стаміўся, я так хачу есці» *(смяецца)*.

***— Пасля алімпійскага трыумфу вашы адносіны змяніліся?***

— Спачатку моцна павысілася цікавасць да Улада і да нашай пары, гэта доўжылася недзе першыя паўтара месяца пасля Алімпійскіх гульняў. Было вельмі шмат званкоў, таму Уладзіславу прыйшлося змяніць нумар мабільнага тэлефона, тэлефанавалі і пісаць пачалі мне. Давялося закрыць усе свае сацыяльныя сеткі, таму што бывалі і непрыемныя моманты.

А калі казаць пра адносіны паміж намі, то з'явілася новая нагода для жартаў, маўляў, цяпер зразумела, хто ў доме галоўны, хто з алімпійскім медалём.

***— Дасягненнямі мераецеся толькі жартам?***

— Вядома. Быў такі перыяд у 2014 годзе, калі мы ішлі нага ў нагу. На ўсіх турнірах выйгравалі аднолькавыя медалі ўвесь сезон.

***— Праўда, што ў Віцебску пасля Алімпіяды здарыўся сапраўдны бум батутнага спорту?***

— Гэта так. Зараз шмат дзяцей прыводзяць займацца. У нас у горадзе дзве добрыя залы, моцная трэнерская школа. Шмат маладых настаўнікаў, якія былі выхаваны старэйшымі калегамі. І атмасфера ў зале вельмі добрая, мы ўжо адна вялікая сям'я, і гэта дае штуршок у развіцці нашага віду спорту.

***— У маі Уладзіслаў зрабіў табе прапанову пажаніцца, як гэта было?***

— Нічога незвычайнага, таму што сам па сабе ён не рамантык. Гэта адбылося ў Піцеры, пасля спаборніцтваў. Цяпер усіх цікавіць — калі вяселле. Каб арганізаваць такую ўрачыстасць, неабходна хоць бы нейкі час быць дома, а мы проста не ўпісваемся ў графік. У наступным годзе апынёмся ў родным Віцебску максімум на тыдзень, дзён на дзесяць. Складана за гэты час нешта прыдумаць, але мы паспрабуем. Хоць, магчыма, што на нашым вяселлі мы будзем наогул толькі ўдваіх. Паедзем куды-небудзь на востраў, распішамся і тыдзень будзем атрымліваць асалоду ад жыцця, усё ж вяселле — гэта ў першую чаргу свята для дваіх.

***— У спартыўнай сям'і рана ці позна камусьці прыходзіцца ахвяраваць сваёй кар'ерай...***

— Вядома, з цягам часу ў нашай сям'і павінны з'явіцца дзеці, гэта неад'емная частка жыцця. Але хацелася б яшчэ выступіць на Алімпіядзе-2020, зрабіць работу над памылкамі пасля Рыа і паказаць, што я здольная на большае. А вось потым ужо будзем планаваць дзяцей.

***— Раней ты адзначала, што ў вас з Уладам зусім розныя інтарэсы.***

— А цяпер мы ўжо настолькі з'ядналіся, што ўсе інтарэсы ператварыліся ў адно. Я яшчэ не паддалася на тое, каб глядзець разам з ім «Зорныя войны», але затое ўжо разбіраюся ў машынах, а Улад пачаў глядзець мае любімыя мульцікі.

**Да тэмы**

Батут трапіў у праграму Алімпійскіх гульняў 16 гадоў таму, дэбютаваўшы ў Сіднэі. Тады беларускую гісторыю пачалі пісаць Дзмітрый Паляруш і Наталля Карпянкова, якія занялі ў фіналах пятыя месцы.

***— Пра што ты марыш?***

— О, я такая летуценная асоба, таму ў мяне шмат самых розных жаданняў. Я хацела б стаць жаўранкам, каб навучыцца рана ўставаць, бельмі складана прачынацца раніцай. Калі казаць пра штосьці больш глабальнае, то мы з Уладам хацелі б пабудаваць свой дом з лазняй і невялікім басейнам.

Яшчэ я мару пра тое, каб у мяне дома былі мае каты, якіх пакуль Улад не дазваляе перавезці ад бацькоў. Я іх люблю, адна кошка пражыла ў мяне 17 гадоў. Я знайшла яе, калі ішла на трэніроўку, адразу зразумела, што яна мая. Але праз некаторы час убачыла аб'яву, што хтосьці шукае кошку, калі шчыра, падумала, што гэта маю, таму разам з сястрой хадзіла па ўсім раёне і зрывалі гэтыя аб'явы. Потым, вядома, аказалася, што дарма, шукалі не яе. Гэтая кошка была ўнікальнай, прадказвала мне ўзнагароды. Падыходзіла да медалёў, якія віселі ў мяне дома, і падкідвала іх лапай некалькі разоў. Колькі разоў падкіне — такое месца я і займала. Калі скідала кубак, то я выйгравала спаборніцтвы.

***— Як бачыш сябе праз 15—20 гадоў?***

— Я задумвалася над гэтым пытаннем, але пакуль не магу знайсці адказ. Мяне цікавяць многія сферы, напрыклад, псіхалогія, на нейкі час хацелася б з'ехаць у Тыбет, вывучыць нейкія практыкі. Люблю знаходзіцца ў Італіі, там вялікая гісторыя на кожным кроку, мне гэта таксама цікава. Мару паўдзельнічаць у археалагічных раскопках.

■ Экспрэс-навіны

# «БРОНЗАВЫЯ» РЫБКІ КРАІНЫ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра старт «маладзёжкі» на чэмпіянаце свету, выніκі плыўцоў на планетарным першынстве ў Канадзе і пра этап Кубка свету па біятлоне ў Паклюцы.**

**1.** ***У канадскім Віндзары завяршыўся чэмпіянат свету ў 25-метровым басейне.*** Медалі на гэтым форуме ўзялі і нашы суайчыннікі. Бронзавую ўзнагароду на дыстанцыі 50 м на спіне заваяваў Павел Санковіч, ён паказаў вынік 23,03 секунды. Пазней яшчэ адзін медаль у скарбонку зборнай прынёс квартэт у складзе Паўла Санковіча, Ільі Шымановіча, Яўгена Цуркіна і Антона Латкіна. Хлопцы занялі трэцяе месца ў камбінаванай эстафеце 4x50 м, беларуская каманда пераадолела дыстанцыю з вынікам 1 хвіліна 32,49 секунды, усталяваўшы новы рэкорд Беларусі.

**2.** ***На выхадных прайшлі чарговыя гонкі другога этапу Кубка свету па біятлоне ў славенскай Паклюцы.*** Па выніках жаночай гонкі праследавання дзве беларускія біятланісткі — Надзея Скардзіна і Ірына Крыўко — трапілі ў дваццатку лепшых. Надзея дапусціла адзін промах на заключным рубяжы і стала 16-й. Ірына пераадолела ўсе агнявыя рубяжы без памылак і заняла 18-е месца.

Завяршыўся другі этап Кубка свету эстафетамі. Наша жаночая зборная заняла там дзявятае месца, а вось у мужчынскай камандзе здарыўся інцыдэнт, які не дазволіў нашым спартсменам завяршыць гонку. У ходзе першага этапу Сяргей Бачарнікаў упаў на адным з стромкіх спускаў і зламаў вінтоўку. На агнявым рубяжы суддзі замянілі зброю, але беларус не змог удала правесці стральбу, зарабіўшы 6 штрафных кругоў на двух рубяжах. Другім на дыстанцыю адправіўся Уладзімір Чапелін, аднак лідары эстафетнай гонкі з іншых зборных абышлі беларуса на круг, з-за чаго суддзі прынялі рашэнне зняць наш квартэт з дыстанцыі.

Нагадаем, трэці этап Кубка свету пройдзе ў чэшскім Нова Места з 15-га па 18 снежня.

**3.** ***Маладзёжная зборная Беларусі (U-20) па хакеі з перамогі стартавала на чэмпіянаце свету ў дывізіёне I у групе A.*** На старце турніру нашы хлопцы абыгралі аднагодкаў з Францыі — 6:3, а затым сустрэліся з камандай Нарвегіі.

Завершыцца турнір 17 снежня. Пераможца атрымае права ў наступным сезоне згуляць у топ-дывізіёне з наймацнейшымі маладзёжнымі зборнымі.

**4.** ***У розыгрышы чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі прадстаўнікі мінскага «Дынама» на дамашняй пляцоўцы абыгралі «Медвешчак» — 6:2.*** Цяпер пасля 39 матчаў «зубры» маюць у сваім актыве 64 ачкі і займаюць шостае месца ў турнірнай табліцы Заходняй канферэнцыі. Наступны матч мінскія хакеісты правядуць у Навакузнецку з мясцовым «Металургам».

**5.** ***У Празе прайшла жараб'ёўка групавога этапу фінальнай стадыі жаночага чэмпіянату Еўропы па баскетболе, які пройдзе летам 2017-га ў Чэхіі.*** Наша каманда пад кіраўніцтвам новага галоўнага трэнера Наталлі Трафімавай згуляе ў папярэдняй групе B з камандамі Італіі (16 чэрвеня), Славакіі (17 чэрвеня) і Турцыі (19 чэрвеня).

Нагадаем, беларускія баскетбалісткі дэбютавалі на чэмпіянаце Еўропы ў 2007 годзе ў Італіі і адразу ж заваявалі бронзавыя медалі. Яшчэ двойчы дзяўчаты фінішавалі чацвёртымі (2009, 2015), па разе былі пятымі (2013) і дзявятымі (2011).

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by



**Па гарызанталі: 2.** Пушысты, валакністы матэрыял, звычайна з баваўны, прызначаны для медыцынскіх, бытавых і тэхнічных мэт. **4.** Ручное прыстасаванне ў выглядзе складнога паўкруга, якім абмахваюцца ў духату. **7.** Самая халодная пара года паміж восенню і вясной. **8.** Кантора, канцылярыя, служба. **9.** След, пракладзены лыжамі. **10.** Павадыр статка, чарады. **11.** Спецыяльнае памяшканне, дзе мыюцца і парацца. **13.** Пачуццё і стан вельмі моцнага спалоху. **18.** Аддзел установы, дзе захоўваюцца старыя дакументы, скончаныя справы. **19.** Старадаўняя сярэбраная, затым залатая манета ў некаторых заходнееўрапейскіх краінах. **20.** Установа, якая ажыццяўляе рознічны гандаль. **21.** Імклівы напад на пазіцыі праціўніка. **24.** Малюнак бога або святога ў выглядзе партрэта як прадмет рэлігійнага паклонення. **28.** Лісцевае дрэва сямейства вярбовых з зеленавата-шэрай гладкай карой. **30.** Паведамленне пра змены ва ўзаемных разліках паміж прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі аб пераводзе грошай. **32.** Муж маці ў адносінах да яе дзяцей ад папярэдняга шлюбу. **33.** Звяно гусеніцы. **34.** Хімічны элемент, газ без колеру і паху. **35.** ... каля хаты крычыць — да нараджэння дзіцяці *(прыкм.)*. **36.** Старадаўні сорт паволжскай яблыні, на якой растуць сакаўныя, кісла-салодкія яблыкі.

**Па вертыкалі: 1.** Лісцевае дрэва сямейства ліпавых з сэрцападобнымі пілаватымі лістамі і жаўтаватымі духмянымі меданоснымі кветкамі. **2.** Род буйных яшчарак, якія водзяцца ў паўднёвых краінах. **3.** Узяцце пад варту; пазбаўленне волі. **4.** Вялікая прадаўгаватая пасудзіна для мыцця, купання. **5.** Гучны, нястрыманы смех. **6.** Урачыстая песня, прынятая як сімвал дзяржаўнага або класавага адзінства. **10.** Тоўстая жэрдка або бервяно для падважвання цяжкіх прадметаў. **12.** Глядзі фота. **14.** Народны паэт Чувашыі. Пераклаў на чувашскую мову паасобныя вершы А. Куляшова. **15.** Сумесная работа на марскім судне, у якой удзельнічае ўся каманда. **16.** Вышэйшая мэта, да якой імкнуцца людзі і якая кіруе іх дзейнасцю. **17.** Размер заработнай платы, устаноўлены ў адпаведнасці з пасадай работніка. **20.** Беларускі народны абрад, пашыраны на калядах. **22.** Высокі двухколы воз у Сярэдняй Азіі. **23.** Мінерал, разнавіднасць агату, у якім чаргуюцца слаі чорнай і белай афарбоўкі. **25.** Кароткі літаратурны твор алегарычнага зместу з павучальнай канцоўкай. **26.** Паўднёвае пладовае дрэва сямейства ружакветных, род дробнай слівы. **27.** Грошы (часам і прадукты), якія выдаюцца наперад у лік зарплаты. **29.** Сельскагаспадарчая ручная прылада ў выглядзе вельмі выгнутага дробна назубленага нажа для зрэзвання злакаў з кораня. **31.** Ударны сігнальны падвясны інструмент у выглядзе ўсечанага пустога конуса з падвешаным усярэдзіне ўдарнікам.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,**
*г. Мінск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 2. Вата. 4. Веер. 7. Зіма. 8. Офіс. 9. Лыжня. 10. Важак. 11. Лазня. 13. Страх. 18. Архіў. 19. Дукат. 20. Крама. 21. Атака. 24. Абраз. 28. Асіна. 30. Авіза. 32. Айчым. 33. Трак. 34. Неон. 35. Сава. 36. Аніс.

**Па вертыкалі:** 1. Ліпа. 2. Варан. 3. Арышт. 4. Ванна. 5. Рогат. 6. Гімн. 10. Вага. 12. Янот. 14. Ухсай. 15. Аўрал. 16. Ідэал. 17. Аклад. 20. Каза. 22. Арба. 23. Онікс. 25. Байка. 26. Альча. 27. Аванс. 29. Серп. 31. Звон.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.20 | 16.47 | 7.27 |
| Віцебск — | 9.18 | 16.29 | 7.11 |
| Магілёў — | 9.11 | 16.37 | 7.26 |
| Гомель — | 8.59 | 16.42 | 7.43 |
| Гродна — | 9.34 | 17.04 | 7.30 |
| Брэст — | 9.26 | 17.13 | 7.47 |

## Месяц

*Першая квадра 07.12—13.12.*
*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

***Пр.*** *Андрэя*
***К.*** *Люцыі, Юліі, Пятра, Уладзіміра.*



Фота Соф'і КУСЯНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




# «БЯСПЕЧНЫ НОВЫ ГОД!»

**Рэспубліканская акцыя пад такой назвай упершыню стартавала ў краіне**

**Арганізатарам мерапрыемства выступіла Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Мэта акцыі — папярэдзіць надзвычайныя сітуацыі, якія ўзнікаюць у выніку парушэння правілаў пажарнай бяспекі пры падрыхтоўцы да свят, неасцярожнага абыходжання з піратэхнічнымі вырабамі.**

Мерапрыемства праходзіць у чатыры этапы. Супрацоўнікі МНС ужо наведалі санаторыі, аздараўленчыя цэнтры, прафілакторыі, дамы адпачынку, пансіянаты і расказалі аб правілах бяспекі. З 13 па 20 снежня акцыя пройдзе ў агульнаадукацыйных установах, інтэрнатах, установах пазашкольнай работы, дамах сямейнага тыпу. 21—27 снежня ратавальнікі нагадаюць аб бяспечным выкарыстанні феерверкаў у месцах продажу піратэхнічных вырабаў, на лядовых катках, у дзіцячых установах аховы здароўя. Завяршальны этап будзе праходзіць у месцах масавага знаходжання людзей — на вакзалах, станцыях метро, рынках, буйных гандлёвых цэнтрах і інш. — з 28 па 30 снежня.

У мерапрыемстве прымуць удзел і актывісты Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных, клубаў юных ратавальнікаў, а таксама добраахвотнікі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Даты | Падзеі | Людзі

## 13 СНЕЖНЯ

**1797** год — нарадзіўся Генрых Гейнэ, нямецкі паэт, публіцыст, крытык. Гейнэ лічыцца апошнім паэтам «рамантычнай эпохі» і адначасова яе вяршыняй. Ён зрабіў размоўную мову прыдатнай да лірыкі, падняў фельетон і дарожныя нататкі да мастацкай формы і надаў раней не вядомую элегантную лёгкасць нямецкай мове. На яго вершы пісалі песні кампазітары Франц Шуберт, Роберт Шуман, Рыхард Вагнер, Ёган Брамс, Пётр Чайкоўскі і многія іншыя.



**1816** год — дата нараджэння Эрнста Вернера фон Сіменса — нямецкага інжынера, вынаходніка і заснавальніка вялізнага канцэрна, які паспяхова дзейнічае і дагэтуль. Самым галоўным дасягненнем Сіменса было развіццё тэлеграфных камунікацый.

**1891** год — мінская гарадская дума прыняла пастанову «Аб зборы за ўтрыманне сабак». З таго дня кожны гараджанін, у гаспадарцы якога меўся чатырохногі гадаванец, павінен быў выплачваць у казну па адным рублі ў год. Прычым ні парода, ні памер сабакі не мелі значэння. Гаспадары, якія выплацілі рубель (дзённы заробак рабочага), атрымлівалі значок, які павінны былі мацаваць да ашыйніка жывёлы.

**1920** год — на 2-м Усебеларускім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў прыняты дапаўненні да Канстытуцыі БССР 1919 года і ратыфікаваны прэлімінарны дагавор паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. З'езд выказаўся за пераклад усіх дзяржаўных устаноў на беларускую мову.

**1941** год — 75 гадоў таму нарадзіўся (в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна) Мікола (Мікалай Аляксандравіч) Маляўка, беларускі пісьменнік. У 1965 годзе скончыў БДУ. Аўтар паэтычных зборнікаў «Едуць маразы», «Жалеза», «Круг» і інш. Для дзяцей напісаў кнігі «Дзед і ўнучка» і «Як дом будавалі». Асобныя вершы паэта пакладзены на музыку беларускімі кампазітарамі.

**Было сказана**

**Максім БАГДАНОВІЧ, паэт, перакладчык, публіцыст:**
*«Усё праходзіць, знікае, як дым. Светлы ж след будзе вечна жывым».*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Хто там?**
**— Адчыніце, мне трэба сказаць вам нешта вельмі важнае!**
**— Дык кажыце.**
**— Гэта не дамафонная размова!**
**— Не адчыню.**
**— Увогуле... Я ваш участковы.**
**— Вы да нас ужо прыходзілі, у нас вашага пісталета няма.**

Жонка сказала: «Давай спынімся каля крамы, хлеба купім». Карацей, ледзь багажнік зачыніў.

**— Жанаты чалавек не павінен гуляць у карты на грошы.**
**— Гэта чаму?**
**— Калі ён прайграе, жонка яго лае, а калі выйграе, жонка адбірае ў яго выйгрыш.**




Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

ОАО «Рыбхоз «Красная Зорька» в связи с ликвидацией
ПРОИЗВОДИТ ПРОДАЖУ ТОВАРНОЙ РЫБЫ:
• КАРП, ТОЛСТОЛОБИК;
• РЫБОПОСАДОЧНЫЙ МАТЕРИАЛ: КАРП.
По вопросам приобретения обращаться по тел. 8 029 645 45 14, Лукашев Д.Л.
УНП 400044343

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4966.
Нумар падпісаны ў 19.30 12 снежня 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12